Артур Клінаў ☞ 3

Ніва

ТЫДНЁВІК БЕЛАРУСАЎ У ПОЛЬШЧЫ

PL ISSN 0546-1960

NR INDEKSU 366714

Князь Астрожскі ☞ I-IV

http://niva.iig.pl

redakcja@niva.iig.pl

№ 38 (2732) Год LIII | Беласток, 21 верасня 2008 г. | Цана 2,00 зл. (VAT 0%)

Паміж суседзямі ў Сухаволі

Тэкст і фота Ілоны КАРПЮК

Чацвёрты раз Сухаволя наладзіла турнір „Паміж намі суседзямі" і хаця ў два дні сяброўскія гміны спаборнічалі ў шматлікіх канкурэнцыях, то як кажа бурмістр гэтага гарадка Юры Амелян, ідэя мерапрыемства заключаецца ў самой сустрэчы.

13-14 верасня былі сапраўды актыўнымі днямі ў Сухаволі. Улады і дзеячы стараліся годна прыняць гасцей гэтай зямлі, а жыхары стараліся пакарыстацца тым, што праз два дні іх мясцовасць была не толькі геаграфічнай сярэдзінай Еўропы, але яе культурным сэрцам.

— Мы тут прыязджаем ужо восьмы год, — з задавальненнем інфармуе мяне Валеры Сак, рэгент духавога аркестра ды адначасова дырэктар музычнай школы ў Парэччы, што ў Гродзенскай вобласці, — усё пачалося з параду аркестраў!

Сухаволя вядомая гэтым мерапрыемствам. Як месца ў цэнтры Еўропы прабуе праіснаваць на культурнай карціне прынамсі гэтай часткі свету. Дзеля гэтага арганізуецца Еўрапарад духавых аркестраў, турнір танца „Europe Center Cup", але і Міжнародны турнір гмін, у якім сёлета ўдзел прыймалі: Сухаволя і Штабін як прадстаўнікі польскага боку, Старыя Трокі і Зуюны — літоўскія сябры, ды Індура і Парэчча — госці з Беларусі. Першы дзень гэта паказчык спраўнасці і хуткасці, бо гмінныя каманды прэзентаваліся ў футболе, валейболе і ў лёгкай атлетыцы. Стомленасць удзельнікі перамагалі ў час вячэрняга канцэрта ды дыскатэкі пад зоркамі, хаця большасць з іх рыхтавалася пэўна да нядзельных прэзентацыяў. Наведвальнікі турніру ў Сухаволі маглі паглядзець паасобныя прэзентацыі гмінаў на сцэне, але не толькі. Бывала, што калектывы спявалі на сцэне, а на плошчы перад сцэнай іншыя арганізаваліся ў пары і паланілі сэрцы гледачоў сваім танцам. Калі гаворка пра танец, дык і чыноўнікі прэзентавалі свае таленты ў рытмах вальса і дыска, а „Белыя розы" ў іх выкананні гэта быў проста гіт. Увагу засяроджвалі і іншыя канкурэнцыі, але самы вялікі натоўп круціўся ля гмінных стэндаў. Можна было паглядзець розныя цікавінкі, набыць рукадзелле, пачаставацца свойскай ежай, часам нават свойскімі напоямі!

— Больш няма, прабачце! — вясёлая жанчына з Парэчча тлумачыць мясцовым, што за чаркай дарма стаяць (а ахвотных сапраўды было шмат).

— Два літры разлілі, ужо няма, — дадае яе калега і хутка бяжыць на пляц, каб узяць удзел у чарговай канкурэнцыі.

„Беларусь вельмі блізка, толькі часам мяжа і існаванне візаў перашкаджаюць у кантактах..."

Атмасферы варта арганізатарам павіншаваць. Усе здаюцца адчуваць сябе як у вялікай сям'і.

— Гэтае мерапрыемства для таго, каб мы тут пазнавалі сябе ўзаемна, — кажа бурмістр Сухаволі. — Сапраўды цікава паглядзець у чым мы падобныя, але і чым ад сябе адрозніваемся. Варта ладзіць у далейшым супрацоўніцтва з суседнімі і замежнымі гмінамі. Беларусь вельмі блізка, толькі часам мяжа і існаванне візаў перашкаджаюць у кантактах.

— Больш няма, прабачце!

„Прыязджайце да нас!" — запрашаюць усе гміны, асабліва парэчанская: „Прымем вас з адкрытымі рукамі, а і візавыя клопаты вырашым!"

Застаецца толькі ехаць. Адны вабяць азёрамі, іншыя лакальным мастацтвам, яшчэ іншыя смакам гарэлкі — усе прапановы вартыя абмеркавання. А пераконвае шырокая ўсмешка на тварах гаспадароў мерапрыемства ды замежных гасцей.

— Госці? Мы тут ужо ў сябе, — дадае спадар Сак. — Два гады таму мы падпісалі дагавор пра супрацоўніцтва з уладамі Сухаволі. Неўзабаве будзем тут ладзіць музычны лагер для дзяцей і моладзі, бо тут на месцы няма такіх прафесіяналаў як у нас.

У галовах удзельнікаў наражаюцца ўжо чарговыя ідэі. Хаця войт Індуры кажа, што сур'ёзнае супрацоўніцтва, эканамічнае, гаспадарчае, гэта справа якую вырашаюць „вярхі", то маем аднак пазітыўны прыклад на Гайнаўшчыне, калі гаспадары атрымалі ў падарунку ад беларускага завода трактар. Значыцца, усё магчыма!

— Мы ўжо нават за грошы Еўразвязу запісалі дыск з музыкай! — дадае наш сябра з Парэчча.

О то і то! — хочацца сказаць. І хаця асяродкі для адпачынку над возерам Белым мне не вельмі былі да густу, то таму, што жывуць там вынаходлівыя парэчане — выберуся з візітам у чарговы раз. А ўсіх Сухаволя запрашае прыехаць на турнір ужо праз год.

Дэградацыя ☞ 2

Віктар САЗОНАЎ

Выбарчая кампанія 2008-га году на Беларусі набліжаецца да свайго завяршэння. Гэтая, яшчэ адна кампанія эпохі кіравання Лукашэнкі, па вялікаму рахунку мала чым адрозніваецца ад іншых кампаній гэтай эпохі. Прыкладам, на Гарадзеншчыне, участковыя камісіі як і раней засталіся без прадстаўнікоў апазіцыі. Пасля гэтага можна было б і не гуляць у выбарчыя гульні...

Цэнтр у Кляшчэлях ☞ 4

Аляксей МАРОЗ

Беларусы замежжа ☞ 8

Цішка ДЗЕНІСЮК

Тэатр „ЗНІЧ" ☞ 9

Міра ЛУКША

Малебен ☞ 12

Фотарэпартаж Ганны КАНДРАЦЮК

9 770546 196000

Дэградацыя

Выбарчая кампанія 2008-га году на Беларусі набліжаецца да свайго завяршэння. Гэтая, яшчэ адна кампанія эпохі кіравання Лукашэнкі, па вялікаму рахунку мала чым адрозніваецца ад іншых кампаній гэтай эпохі. Прыкладам, на Гарадзеншчыне, участковыя камісіі як і раней засталіся без прадстаўнікоў апазіцыі. Пасля гэтага можна было б і не гуляць у выбарчыя гульні. Але ўсёведаючыя кандыдаты ў дэпутаты недзе разнюхалі, што ўлада можа прапусціць у парламент некалькі апазіцыянераў. Каб паказаць Захаду што выбары справядлівыя. Ну і кожны мае спадзеў патрапіць у гэты спіс і паказаць Захаду, што выбары сапраўды справядлівыя. Хоць кожны апазіцыйны кандыдат і раней, і зараз, сцвярджаў і сцвярджае, што справядлівасцю тут і не пахне. І ідуць яны на выбары менавіта для таго, каб падкрэсліць іх несправядлівасць. Але ў склаўшайся сітуацыі ўжо не рашэнні соймаў, ні партыйнага кіраўніцтва, не могуць спыніць бег кандыдатаў да канца выбарчага фінішу, за якім, так кажуць усе, або чарговае расчараванне, або сваім прыкладам пацвярджэнне справядлівасці выбараў. Дзіўная ў чалавека псіхіка.

У мінулыя часы было прыдуманае вялікае пакаранне. Чалавека даводзілі да стану поўнай дэградацыі шляхам выканання цалкам бессэнсоўнай работы. Прысуджаны да пакарання набіраў рыдлёўкай вядро пяску, падымаўся па драбіне на вежу і высыпаў пясок уніз. Пасля спускаўся і зноў набіраў пясок у вядро, каб зноў высыпаць яго на тое месца з якога ён быў узяты. Вельмі хутка такі чалавек вар'яцеў, ужо не мог нармальна ўспрымаць рэчаіснасць, і толькі тое рабіў, што насіўся з вядром пяску ўверх па драбіне, каб высыпаць пясок уніз. Ён без гэтай работы ўжо не мог жыць і бессэнсоўна паўтараў і паўтараў нікому непатрэбныя фізічныя рухі, якія на самым пачатку рабіў толькі пад прымусам і з вялікай неахвотай. Ён ужо не мог думаць лагічна і ўкладваць логіку ў свае дзеянні.

Штосьці падобнае зараз адбываецца ў нас. Стомленыя каманды кандыдатаў, якія сцвярджалі што не змагаюцца за выйгрыш на выбарах, бо тое немажліва, а толькі займаюцца інфармаваннем выбарцаў пра палітычную ды эканамічную сітуацыю ў Беларусі, паранейшаму працягваюць гэта сцвярджаць. Мала таго, працягваюць у гэта верыць. Яны нават перакананыя што так і робяць. Хоць у руках трымаюць зусім іншыя матэрыялы — праграму ды біяграфію выключна свайго кандыдата. Прычым (гэта новае на выбарчым працэсе ў старадаўняй Гародні) надрукаваныя выключна на рускай мове. Калі пытаешся чаму па-руску, адказваюць, што так лягчэй выйграць выбары. Калі пытаешся, ці сапраўды кандыдат збіраецца выйграваць выбары, адказваюць што не, бо тое немажліва ў нашай рэчаіснасці. Хочацца зразумець тады, што ўвогуле яны робяць? Адказваюць, што выкарыстоўваюць легальную магчымасць інфармавання выбаршчыка пра палітычную і эканамічную сітуацыю ў Беларусі. Зноў тады дапытваешся, чаму ж у такім разе ў змесце ўлётак, пра тое, пра што інфармуецца выбаршчык, нічога не напісана. І чаму ўлёткі надрукаваныя па-руску? Зноў адказваюць, што так лягчэй выйграць выбары. Кола замкнулася. Знайсці логіку ў дзеяннях і словах не ўяўляецца магчымым. Як гаворыцца, патанняў больш няма і быць не можа. Дыягназ вызначаны.

А што ж будзе, калі некалькі апазіцыянераў прапусцяць у парламент? Будзе ўсё проста. Тады тыя, хто пайшоў на выбары, каб паказаць іх нелегітымнасць, зробяць легітымнымі і выбары і парламент. А як жа інакш. Там жа будзе Сам Ён, вялікі і непаўторны дэпутат ад апазіцыі. А чаго не зробіш дзеля сябе любімага.

Ну а калі ўлада ўсё ж нікога не прапусціць, то тады можна заявіць і пра несапраўднасць выбараў і нелегітымнасць парламенту і адразу пачынаць рыхтавацца да чарговай выбарчай кампаніі, каб паказаць яе несправядлівасць і выкарыстаць выбарчы працэс дзеля інфармавання насельніцтва пра эканамічную і палітычную сітуацыю шляхам распаўсюду ўласнай біяграфіі, ды яшчэ ўласнай і найразумнай праграмы. Эх, якая цяжкая гэта работа, цягаць пясок па драбіне на вежу, каб высыпаць яго адтуль назад.

P.S. Кажуць, ад поўнай дэградацыі пры такой рабоце дапамагае гарэлка. Хоць некаторыя сцвярджаюць, што і ад яе можна здэградавацца.

Віктар САЗОНАЎ

Там, дзе нас няма

Жнівеньскую вайну ў праваслаўнай частцы Каўказа некаторая аўдыторыя ўспрымае са здзіўленнем, як гэта, маўляў, могуць аднавернікі ўхапіцца за чубы. Аднак на Каўказе не пра тэалагічныя догмы пайшло змаганне, толькі — па прароцтве Леніна — пабіліся два імперыялісты, малы з вялікім. Быццам і не быць гаворцы пра праваслаўную міжусобіцу... Аднак у час каўказскага накалу страсцей, 24 жніўня, перадавіцамі сербскіх медыяў завалодаў ньюс пра схватку тамашніх праасвяшчэнстваў, епіскапаў Сербскай праваслаўнай царквы.

У палове жніўня на сайце СПЦ з'явілася інфармацыя пра абнаўленне цэркваў на Косаве, якое пад царкоўнай юрысдыкцыяй Рашка-Прызрэнскай епархіі; ад СПЦ гэтыя працы курыруе вікарны рашка-прызрэнскі епіскап Феадосій. Уладыка паінфармаваў, мінш., што да тэндэраў для абнаўлення цэркваў прыступаюць албанскія фірмы і з гэтай работай яны спраўляюцца акуратна. Гэтага не мог сцярпець рашка-прызрэнскі епіскап Арцемій, які лічыць, што толькі сербы з'яўляюцца абраным для храмаабнаўлення народам. А паколькі Феадосій з'яўляецца вікарным епіскапам у ягонай епархіі, дык згодна свайму разуменню царкоўнага ўстава Арцемій выдварыў яго разам з ягоным протаіерэем з пасад. З пісьмовай гэтай пастановай паслаў ён свайго сакратара Сімяона Вілоўскага ў манастыр Высокія Дэчаны, дзе ігуменам уладыка Феадосій. Дэчанскія манахі не ўпусцілі Сімяона ў свой манастыр. Тады падаўся туды асабіста сам Арцемій са світай; уладыку прынялі так як трэба, але ягонага сакратара мясцовыя зараз выдварылі навонкі. Сам Арцемій зараз таксама пакінуў дэчанскі манастыр, уручыўшы адрасатам сваю пастанову, аднак яны яе адкінулі, бо палічылі беспадстаўнай. Падняўся вялікі медыйны шум, быццам у ходзе тусоўкі Вілоўскаму зламалі нагу, аднак медыцынскае абследаванне выявіла толькі крыху пабітую пяту.

Сабраны на скорую руку сінод СПЦ назваў рашэнне Арцемія непрадуманым і загадаў спыніць усе міжусобныя спрэчкі, але адначасна абнародаваў засакрэчаную дагэтуль сваю пастанову ад 19 мая 2006 года, якая патрабавала ад Арцемія вызвалення Вілоўскага з усіх займаемых ім функцый (з прычыны розных злоўжываванняў епіскапавага сакратара), адрачэння ад кватэр у Сербіі ды ад гаспадарчай дзейнасці. Епіскап Арцемій курыруе адну з байкаватых будаўнічых фірм і менавіта яе ён бачыць адзіным выканаўцам абнаўлення косаўскіх храмаў. А ягоныя кватэры ў Бялградзе ён назваў дарамі ад удзячнай паствы; мне цікава, ці гэтыя „дары", якія ў свецкай сферы называюцца папросту хабарам, не ад фірмаў, якія ён курыруе. Да таго ж яшчэ Арцемій ці мо яго давераны паведамілі, што яго, Арцемія, „які непахісна бароніць адлучэння сваёй тэрыторыі" ад „стварэння мафійна-бандыцкага ўтварэння Вялікай Албаніі", хочуць адхіліць па дырэктыве Пентагона. Прэзідэнта Сербіі Барыса Таджыча, якога ў свеце лічаць еўрафілам, апальны ўладыка назваў здраднікам... Патрабаванні сабора СПЦ ад 2006 года Арцемій назваў неактуальнымі...

Старых дрэў не перасаджваюць, але вярхі СПЦ яшчэ вераць, што Арцемій з Саўла стане Паўлам, яшчэ намагаюцца яго абласкавіць. Вось вытрымка з заявы сінода СПЦ ад 26 жніўня г.г.: „У гэтых бедах, якія спасцігілі нашу Царкву і наш народ на Косаве, епіскап Арцемій, ягонае свяшчэнства і манаства ды верны народ маюць салідарнасць і падтрымку цэлай нашай Царквы ў сведчанні Хрыстовай любві, ісціны, міру, праўды і ўсякага дабра".

Сербскія інтэрнэт-карыстальнікі ў пераважнай большасці вельмі крытычна паставіліся да Арцемія; вось адна з вэб-адгалосак: „Гляджу на тых людзей і думаю, якую сувязь мае ўся гэтая падзея з тым, чым кожная царква, у тым і СПЦ, апраўдвае сваё існаванне — прапаведаванне Хрыстовага навучання? Чым тыя людзі займаюцца ў сапраўднасці?.." Шмат сербаў пытае пра ролю СПЦ у распальванні пажарышча пад былой Югаславіяй. Але ёсць і іншая вэб-заява пра згаданыя вэб-адгалоскі ў адрас галоўнага косаўскага епіскапа: „Гэтага крыжаносца і раўніваго архірэя Хрыстовай царквы лёгка пазнаць у евангельскім пісанні: «Шчасныя вы, калі будуць вас абражаць і гнаць і ўсякай няпраўдай і словам ліхім зневажаць за Мяне. Радуйцеся і весяліцеся, бо вялікая вам узнагарода ў небе, так гналі прарокаў, якія былі перад вамі»".

Епіскап Арцемій з'яўляецца кумірам беластоцкага палітправаслаўнага актыву дык, мабыць, трэба радавацца і весяліцца такой натхнёнай тутэйшай ідалатрыі. Ну, мы, тут часам дзівуемся паводзінам некаторых польскіх духоўных асоб. Бо і якое, для скромнага прыкладу, можа быць „наша" названне „прэзідэнціхі-чараўніцы" з „прэзідэнтам-здраднікам" сербскіх братоў-славян? Вось бы пайшлі за іх прыкладам нашы польскія „власти и воинство" ў наступленне „мірам Госпаду памаліцца"! Вось бы нам была радасць!

Аляксандр ВЯРБІЦКІ

Вачыма еўрапейца

Сустрэча: мык-мык!

Рэдка даюся я дзіву ў чым-небудзь. Аднак у апошнюю пятніцу ў такі стан увяло мяне Польскае міністэрства замежных спраў. Вось перад поўднем я ўвайшоў на інтэрнэтныя старонкі гэтага ведамства, каб праверыць, што новага адбылося ў пытаннях якраз замежнай палітыкі. І прачытаў камюніке, што ў той самы дзень міністр Радаслаў Сікорскі падасца з некалькігадзінным візітам у Рэспубліку Беларусь на запрашэнне яго беларускага калегі Сяргея Мартынава, а сустрэча адбудзецца ў Віскулях, там, дзе быў падпісаны дакумент аб роспуску СССР. Далей было напісана: „Міністры замежных спраў Польшчы і Беларусі абмяркуюць пытанні звязаныя з еўрасаюзнай праблематыкай і кранаючыя двухбаковыя адносіны. Фіксуючы прагрэс, які адбыўся за мінулае паўгоддзе, польскі бок будзе кранаць пытанні якія будуць служыць далейшаму развою і нармалізацыі адносін з Беларуссю. Гаворка тут між іншым пра справы звязаныя з бяспекай межаў, забеспячэннем транзіту сыравіны ў Польшчу, супрацоўніцтвам пры энергетычных праектах ды ўдзелам польскіх фірмаў у прыватызацыі фірм дзяржаўнага сектара". Візіт і гэты план праблематыкі размоў гучалі як прадказанне пералому ў нашых двухбаковых кантактах, а асабліва пералому ў кантактах на высокім дзяржаўным узроўні.

Увесь час, аднак, пасля прачытання гэтага камюніке турбавала мяне пытанне, чаму так раптам Радаслаў Сікорскі рашыў падацца на Беларусь; прынамсі ўражанне гэтай раптоўнасці вынікала з парадку перадання паведамлення аб сустрэчы двух міністраў да публічнага ведама. Пасля вяртання ў Варшаву міністр Сікорскі заявіў:

— Польшча лічыць Беларусь еўрапейскай суседкай. Беларусь, праўда, не імкнецца ў Еўрасаюз, аднак жадае набліжэння да яго, бо ўжо сёння ЕС з'яўляецца найбольшым экспартным рынкам для Беларусі..

Я ўсё не мог сабе адказаць, адкуль тая раптоўнасць сустрэчы з міністрам Мартынавым, на два тыдні да парламенцкіх выбараў у Беларусі, якія — як прадбачвалі раней еўрасаюзныя чыноўнікі — маюць быць відавочным тэстам таго, ці Беларусь Аляксандра Лукашэнкі кіруецца ў дэмакратычным напрамку. Пасля сустрэчы прэзідэнтаў краін Вышаградскай групы я пачуў словы прэзідэнта Леха Качынскага:

— Аб візіце пана міністра я даведаўся дзень да гэтага.

Прэзідэнт адзначыў:

—Ці тая адліга сапраўдная? На гэтае пытанне сёння не ўмею адказаць, паколькі ў Беларусі было ўжо некалькі адліг. Пазней яны адыходзілі і не ведаю, ці гэта звязана са зменай канцэпцыі панам Лукашэнкам, ці іншымі фактарамі, але гэтак адбывалася. Затое я хацеў бы глыбока верыць, што гэтая адліга — сапраўдная.

Варта пры нагодзе адзначыць, што сустрэча міністра Сікорскага з міністрам Мартынавым адбылася дзень пасля таго, як адказны за замежную палітыку ЕС Хавер Саляна і камісар па справах суседскай палітыкі Беніта Ферэра-Вальднэр, а таксама прадстаўнікі амерыканскай адміністрацыі прадбачылі „ўсчаце пазітыўных рашэнняў" наконт Беларусі ў сувязі са звальненнем беларускіх палітвязняў (гаворка пра трох, сярод іх пра Аляксандра Казуліна).

Пісаўшы гэты тэкст, я задумваўся, ці ў час размоў Сікорскі — Мартынаў і амерыканска-еўрасаюзна-беларускіх прагучала адназначая заява: „Беларусь жадае сабе свабодных выбараў, палітычных рэформ, свабодных медыяў"?... Мала мяне здзіўляе жадальнае адкрыццё Беларусі на еўрапейскія рынкі збыту, Беларусі — краіны, якой гаспадарчае горла штораз больш заціскае Расія.

Мацей ХАЛАДОЎСКІ

Кожны беларус партызан

Фота Ганны Кандрацюк

Артур Клінаў нарадзіўся ў 1965 г. у Мінску. У 1987 скончыў Беларускую тэхнічную акадэмію (архітэктурны факультэт). Мастак-канцэптуаліст, архітэктар. Аўтар шматлікіх выставак у Беларусі і па-за межамі. Галоўны рэдактар „Партызана."
Рэдакцыя „Нівы" мела нагоду спытацца ў мастака, які свой праект, з якіх ужо дзесяткі набылі шырокую вядомасць, ён сам лічыць найважнейшым:
— Я думаю, што ўсё такі гэта праект „Горад Сонца". Гэта не толькі праект-альбом ці кніжка, гэта цэлая вялікая канцэпцыя, якая ў выніку ператворыцца ў сур'ёзны турыстычны праект. Для мяне было цікава працаваць з такім фарматам, такім матэрыялам. Гэта выключны праект, глабальны. І практычна, гэта праект-міф!

— Ваш мастацкі праект „Партызанская крама" дзейнічае ў самай маленькай і непрыкметнай зале галерэі „Арсенал". Аднак, ён мае дзіўную сілу гравітацыі. Учора, у час адкрыцця вернісажу, многія гледачы пыталіся адзін у аднаго, як папасці ў краму Артура Клінава. Раскажыце пра яго.

— Гэта ў прынцыпе ўжо стары праект, я яго важу па Еўропе ўжо гадоў пяць-шэсць. Упершыню ён быў паказаны ў Францыі ў 2003 г. Сцэнарый гэтага праекта такі: стары гандляр ездзіць з лесу ў лес і прывозіць усё неабходнае для працы, жыцця, адпачынку і змагання партызанаў. Значыць — прывозіць розныя тавары, прывозіць карчму. У праект натуральна ўваходзіць баркарчма і музычная праграма.

Прыязджае крама ў лес і пачынаецца шоў.

Чаму тэма партызанаў? Калі мы першы раз ехалі ў Францыю, трэба было паказаць беларускае мастацтва са сваёй адметнасцю. Тады я падумаў, што адной з важнейшых і адной з найбольш адметных беларускіх тэмаў з'яўляюцца партызаны. Гэта такі беларускі брэнд. Тады з'явілася ідэя паехаць з партызанскім *буцікам* і паказаць тую ўсю дзіўную экспазіцыю, у якую ўваходзіць вельмі шмат розных рэчаў, пачынаючы ад сур'ёзных, як рэальныя творы мастацтва, да звычайнага смецця, якое можна знайсці на вуліцы. Калі іх спалучыць, ствараецца такая нейкая выбуховая сітуацыя, калі іх рэалізаваць у адной прасторы — ствараецца такая дзіўная дзіўнасць.

— У агульным уяўленні, партызаны, — гэта мужчынскі свет. У Вашай „краме" побач парнухі і самагонкі, бачым дзіцячыя цацкі. Канцэпцыя партызанаў пашыраецца тут на сям'ю, на цэлае грамадства?

— Зразумела, гэты *буцік* ёсць адлюстраваннем грамадства. У партызанаў жыццё мела сваю псіхічную спецыфіку, але па іх рахунку яно захоўвала ўсе атрыбуты грамадскасці. У атрадах былі нармальныя шлюбы, дзеці, свае „дыскатэкі". Ясна, што тут мусяць прысутнічаць рэчы на кожны выпадак жыцця, ад шлюбу да пахавання.

— Паводле якіх катэгорыяў Вы фармавалі сваю калекцыю?

— Галоўная катэгорыя такая: рэч мусіць утрымліваць у сабе нейкую асаблівасць, спецыфіку, часам і мне незразумелую. Вось, я мушу шукаць такіх рэчаў у якіх ёсць нейкая дзіўнасць. Гэта не залежыць ад коштаў як і ад іх функцыі. Многія з іх я купляю ў Ждановічах, на так званым „блышыным" рынку. У мяне некалькі такіх калекцыяў. Гэтай, што я прывёз у Беласток, толькі частка. Значная частка калекцыі знаходзіцца ў Празе і Варшаве.

— А які найбольш „дзіўны тавар" Вы прапануеце жыхарам Беластока?

— Мне падабаецца шыльда з цытатай з Чэхава. Я не памятаў пра яе, адкрываю яе тут — і такая нечаканасць!

— На ёй напісана:

ВРАЧОМ ДОЛЖЭН БЫТЬ ЧЕЛОВЕК УРАВНОВЕШЕННЫЙ ПРОФЕСИЯ ВРАЧА — ПОДВИГ ТРЕБУЕТ САМОУТВЕРДЖЭНИЯ ЧИСТОТЫ ДУШИ И ЧИСТОТЫ ПОМЫСЛОВ

— Рэч геніяльная, цытата зробленая ўручную, дошка паліраваная.

— У сам раз для замацавання ў лесе?

— У гэтым праекце прысутнічае вялікі элемент абсурду. Калі такія рэчы спалучаеш разам, атрымоўваецца прастора абсурднасці. У гэтым ёсць пэўны адбітак сучаснага свету.

— Ці ідэя крамы паўстала пад уплывам часопіса „Партызан" („pARTisan")?

— Хутчэй так, часопіс з'явіўся на два гады раней і ён ужо інспіраваў.

— Першы нумар выйшаў ў 2002 годзе і быў прысвечаны...

— Ён быў прысвечаны канцэпцыі партызана. Што такое партызан для беларускай культуры, гісторыі, ментальнасці? І ў ім было некалькі канцэптуальных тэкстаў на гэтую тэму. Між іншым, мой пра „Партызан і антыпартызан". Мы паспрабавалі паглядзець на канструкцыю „партызана" якбы з іншага боку. Звычайна „партызан" асацыяваўся з вельмі невялікім адрэзкам часу, дакладна, з часам другой сусветнай вайны. Мы паспрабавалі пашырыць гэтую канцэпцыю, расцягнуць яе на большую частку беларускай гісторыі...

Фота Ганны Кандрацюк

— Менш-больш на 500 гадоў ...

— Так. І мы паспрабавалі зірнуць на беларускую ментальнасць праз прызму партызанаў. Я асабіста прыйшоў да высновы што ментальнасць партызана ёсць у кожным беларусе. У кагосьці гэта можа быць 100 адсоткаў, у кагосьці 80, у кагосьці 5, але ў прынцыпе, „патрызан" ёсць у кожнай ментальнай канструкцыі.

— Як ён праяўлецца ў цяперашні час?

— Калі казаць пра культуру, я лічу, што на сённяшні дзень уся незалежная беларуская культура існуе і выкарыстоўвае партызанскія прынцыпы. Гэта нават больш. Гэта адзіны і магчымы спосаб яе функцыянавання!

— Агулам выйшла сем нумароў „Партызана". Кожны з іх быў прысвечаны асобнай тэме. Скажыце, якія тэмы Вы паспрабавалі яшчэ асэнсаваць у сваім часопісе.

— Другі нумар быў прысвечаны такой дзіўнай тэме, як „Дэмакратыя і культура". У трэцім мы паспрабавалі асэнсаваць што такое „Горад Менск", чацвёрты нумар гэта „Плошча".— наш погляд на моладзевую рэвалюцыю пасля прэзідэнцкіх выбараў у 2005 годзе, вядома, праз прызму культуры. Пяты нумар прысвечваецца „Вайне", перш за ўсё маецца на ўвазе вайну Расіі з Беларуссю. У шостым нумары вялася дыскусія: „Ці беларусы ёсць вясковай нацыяй"? Існуе такі штамп. І ці ён надалей актуальны, ці нешта змянілася? Ну і сёмы, актуальны нумар, прысвечаны тэме „Лузерства". Мы паспрабавалі асэнсаваць, наколькі праблема лузераў (жыццёвых няўдачнікаў — Г.К.) актуальная для беларусаў у кантэксце культуры.

— Хто перамагае ў „Вашай" вайне Расіі з Беларусссю?

— Гаворка пра вайну культур, пра экспансію расійскай культуры ў Беларусь. У прынцыпе, даць адказ на такую глабальную тэму немагчыма. Ды гэта не ёсць нашай задачай. Для „Партызана" важна справакаваць праблему, прыцягнуць да дыскусіі грамадства.

— Назавіце аўтараў Вашага часопіса.

— У нас ёсць сталае кола аўтараў. Дзякуй Богу, належаць да іх найбольшыя беларускія інтэлектуалы: Валянцін Акудовіч, Алесь Анціпенка, Ігар Бабкоў, Сяргей Харэўскі, Максім Жбанкоў і шмат каго яшчэ можна назваць. У кожны нумар мы стараемся далучаць новых аўтараў.

— Дзе можна набыць часопіс? Якім шляхам яго распаўсюджваеце?

— Я дакончу адказ на папярэдняе пытанне. Мы стараемся друкаваць і рускамоўных аўтараў. Частка тэкстаў — гэта пераклады з рускай мовы. Для нас важна, каб гэтыя дзве групы інтэлектуалаў, паміж якімі доўгі час праходзіла пэўная мяжа, дыстанцыя, спалучыць разам. Гэта для нас прынцыпова важна!

Калі гаворка пра распаўсюджванне, з гэтым фактычна ёсць пэўныя праблемы. Наш часопіс не вельмі ахвотна прымаюць дзяржаўныя крамы. Таму зараз распаўсюджванне ідзе цераз сетку прыватных крамаў, ёсць таксама магчымасць атрымаць часопіс праз інтэрнэт. Восенню мы плануем сур'ёзную прамоцыю ў рэгіёнах, гэта будзе для нас шанц каб пра часопіс даведаліся людзі з-за Менска.

— Выходзіце таксама на чытача ў Еўропе, значная частка тэкстаў перакладзеная на англійскую мову?

— Мы гэта практыкавалі ў трох першых нумарах, пасля ў нас не было такой магчымасці. Зараз, у сёмым нумары, мы вярнуліся да перакладаў.

— Вашыя карціны друкаваліся ў беластоцкім літаратурна-мастацкім часопіе „Карткі", аднак беларусы Беласточчыны асацыююць Вас з паштоўкай „Чаяпіцце". Ці Аляксандр Лукашэнка ведае пра яе існаванне і ці былі нейкія рэакцыі з „таго" боку?

— Ведае, напэўна ведае. У прынцыпе *такіх* рэакцыяў не было, але ёсць *такія* дзяржаўныя структуры, як выданні, куды ў свой час уваход для мне быў закрыты. Гэта праблема *гэтак званых* „чорных спіскаў". Я не ведаю, ці *гэта* было звязана з паштоўкай, ці не. Але, у прынцыпе, спецыяльных рэпрэсіяў у бок маёй асобы не было...

— Бачу, пабыўка ў партызанскай краме робіць сваё, мы пачынаем ўжо размаўляць партызанскім кодам. Скажыце яшчэ, адкуль у Вас столькі энергіі?

— Ведаеце, я лічу, што сітуацыя ў Беларусі не такая фатальная як яна можа выглядаць звонку. У гэтым сэнсе, я вельмі аптымістычна стаўлюся. Праўда, нам цяжка, зараз у нас няма *таго*, няма *сяго*, няма дэмакратыі, няма галерэі, няма арт-рынку, няма літаратурнага рынку... Але трэба глядзець на тэндэнцыі. Глядзець, куды рухаецца краіна, свядомасць, народ. У гэтым сэнсе я бачу шмат пазітыўнага, можна сказаць, што ў Беларусі ідзе працэс самаўсведамлення.

— І на гэтай аптымістычнай ноце я прапаную спыніць нашу гутарку. Дзякую Вам за размову!

— Дзякую!

Гутарыла Ганна КАНДРАЦЮК

Візітная картачка Белавежы

Будучы ў Белавежы, немагчыма не прыкмеціць уязных варот у Палацавы парк, у якім змяшчаецца сучасны прыродазнаўчы музей і адміністрацыйны цэнтр Белавежскага нацыянальнага парку. На фоне варот экскурсіі і паасобныя турысты часта выконваюць здымкі на памятку знаходжання ў Белавежы ці наогул у Белавежскай пушчы. Вароты можна сустрэць таксама на шматлікіх паштоўках. Абавязкова прамільгнуць яны ў кожным тэлерэпартажы з гэтай мясцовасці. Вароты ахвотна пераносяць на палотны мастакі, якія час ад часу сюды заглядаюць.

А вароты паявіліся на гэтым месцы ў 1930-х гадах. Паставіў іх тут, паводле адной версіі, цясляр Стасюк з Заставы, а паводле другой — цясляр Павел Семянюк, таксама з Заставы; не можна выключыць і таго, што вароты ставілі абодва цесляры супольна. У 1950-х гадах вароты перайшлі капітальны рамонт, які выканаў Ян Андрасюк са Стачка. У палове 1990 года старыя вароты былі разабраны, а на іх месцы ўзведзены новыя. Працы гэтыя выканаў сталяр з Трапінкі Аляксей Філіпчук з дапамогай свайго сына Пятра. Новыя вароты былі зроблены на ўзор старых. Выканаўца змяніў толькі весніцы з вялікіх і цяжкіх на меншыя і намнога лягчэйшыя. Разьбу галавы зубра, якая красуецца на варотах, выканаў памерлы ўжо народны разьбяр Сяргей Доўбыш з Заставы. Папярэднія вароты таксама былі ўпрыгожаны разьбой галавы зубра — яе выканаўцам быў айцец белавежскага разьбярста Аляксандр Гігаль, якога таксама няма ужо ў жывых.

Пры старых варотах стаяла яшчэ старожка, у якую ў непагадзь хаваліся паркавыя вартаўнікі. Памятаю іх усіх з сямідзесятых і васьмідзесятых гадоў: Трафім Дэм'янюк, Мікалай Кічкайла, Гаўрыіл Пашко, Аляксандр Грынкевіч і іншыя. Усе яны перайшлі ўжо ў вечнасць, разам са старымі варотамі. А і новым варотам неўзабаве стукне дваццаць.

Пётр БАЙКО

Запрашэнне

Таварыства прыяцеляў Арлянскай зямлі і Войт Арлянскай гміны запрашаюць на незвычайнае культурна-грамадскае мерапрыемства „Карціны мікрасветаў: выпадак Орлі", якое адбудзецца 20 верасня 2008 г. у будынку сінагогі ў Орлі.

Праграма вечара:

17⁰⁰ — адкрыццё часовай фотавыставы „Жыхары Орлі ўчора і сёння";

18⁰⁰ — прэм'ера фільма „Скрыжаванне Орля", знятага Таварыствам прыяцеляў Арлянскай зямлі і Тэлебачаннем Беласток у рамках праграмы „1001 дзеянне ў карысць дыялога" з нагоды Міжнароднага года дыялога культур 2008;

19⁰⁰ — дэманстрацыя фільма Пятра Нестаровіча „Руская полька".

Падчас выставы і ў перапынку паміж фільмамі — рэгіянальная музыка (акардэон і белы спеў). Пасля дэманстрацыі кінакарцін прадугледжваецца дыскусія на тэмы, закранутыя ў фільмах.

Культура, гісторыя і турызм

Размова з дырэктарам Гарадскога асяродка культуры ў Кляшчэлях Марыяй КЛІМОВІЧ.

— Нядаўна ў Кляшчэлях адкрыўся Цэнтр турызму і культуры „Гладышка", у які перасяліўся ваш асяродак культуры. Тут будзе сядзіба Таварыства сяброў Кляшчэлеўскай зямлі і ўтульнае месца для мясцовых мастакоў.

— У выставачнай зале экспануецца разьба мясцовага мастака Славаміра Смыка, а вядучай тэмай яго работ, выкананых з дубу, грушы і яблыні, з'яўляецца жанчына. У іншай зале знаходзіцца экспазіцыя мінералаў Міколы Падлашчыка, сярод якіх — агаты, малахіты, апалы і аметысты. Якраз у яго самая вялікая ў Польшчы калекцыя аметыстаў. Хаця пастаянна жыве ён у Мельцы, лічым яго сваім чалавекам, бо выводзіцца з Кляшчэляў. Тут яго дом, прыязджае ён сюды і адпачывае. Каштоўныя камяні збірае ён ад 50 гадоў, а мінералы з Польшчы састаўляюць толькі пятую частку яго вельмі багатай калекцыі, у якой між іншым камяні з Бразіліі, Уругвая, ці Мадагаскара. На трэцяй выстаўцы мы паказваем жывапіс Барбары Александровіч, якая з вясны да восені жыве ў сваім доме ў Грузкой, дзе таксама і малюе, а на зіму з'язджае ў Варшаву. Прэзентуе яна абстрактныя работы з кветкавымі і жаночымі матывамі. Да адкрыцця нашага цэнтра прымеркаваны быў агляд хронік пажарных каманд з невялікіх мясцовасцей. Узнагароду бурмістра Кляшчэляў атрымала хроніка з Міхалова.

— Ці надалей прадбачваеце ў цэнтры многа месца адводзіць мастакам?

— Прадбачваем, што пастаяннымі будуць экспазіцыі разьбы, жывапісу і мінералаў. Асаблівую ўвагу будзем адводзіць мясцовым мастакам, але хочам таксама прэзентаваць работы іншых творцаў. Прадбачваем таксама супрацоўніцтва з Нараўчанскай галерэяй імя Тамары Саланевіч. Ужо і раней мы супрацоўнічалі з Таварыствам сяброў Кляшчэлеўскай зямлі, паказвалі выстаўкі нашых мастакоў і хочам працягваць гэтую дзейнасць.

— „Гладышка" — чорны, выпалены з гліны гаршчок. Ці называючы ваш цэнтр „Гладышкай", хацелі вы звярнуць увагу на ганчарскую традыцыю Кляшчэляў?

— Так, ужо ў самой назве цэнтра мы вырашылі вярнуцца да традыцыі масавага вырабу ў Кляшчэлях гаршкоў. Гладышка — гэта асаблівы гаршчок, характэрны якраз для Кляшчэляў. Мусіў ён чорны быць, без вуха і дзюбіка, служыў для захоўвання смятаны. У Дабрывадзе называлі яго гладункай (так як і ў многіх мясцовасцях Гайнаўшчыны — А. М.). Наш намер — стварыць у цэнтры ганчарскую майстэрню і паказваць людзям, як ганчары з Кляшчэляў выконвалі гаршкі. А наблізяць нам ганчарскую справу Фёдар Янушэк, вучань апошняга кляшчэлеўскага ганчара Лявона Саласцюкевіча, і наша інструктар Яўгенія Казімярук, якая вучылася ганчарскаму рамяству на майстар-класах. Сабралі мы ўжо ганчарскія вырабы кляшчэлеўскіх рамеснікаў (гаршкі, вэртыхі, збанкі, дваякі), якія памесцім у новым будынку. У мінулым было ў Кляшчэлях больш за дваццаць ганчароў, а паводле іншых меркаванняў — было іх пад сорак. Свае вырабы прадавалі яны ў Кляшчэлях і наваколлі. Пісьмовыя крыніцы згадваюць аб ганчарстве ў Кляшчэлях ужо ў XVI стагоддзі.

— Ці кляшчэлеўскаму ганчарству былі характэрныя чорныя вырабы?

— Так, а з апошніх ганчароў вырабляў іх яшчэ ў сямідзесятых гадах Лявон Саласцюкевіч. Але нашыя ганчары выконвалі таксама гаршкі і ў іншых колерах, напрыклад Уладзіслаў Гладзкі. Апошнім часам прадаваліся таксама дэкаратыўныя вырабы з гліны.

— Ці прадбачваеце арганізаваць таксама майстар-класы па іншых відах кляшчэлеўскага рамяства?

— Мы думалі адрадзіць ткацкія традыцыі. Жыхары Кляшчэляў займаліся таксама кавальствам, гарбарніцтвам, а нават гарэлачнай вытворчасцю. Не хопіць у нас памяшканняў, каб арганізаваць пастаянныя майстар-класы і вучыць даўнім рамёствам. Аднак плануем ладзіць часовыя выстаўкі, на якіх будзем паказваць вырабы колішніх кляшчэлеўскіх рамеснікаў. Аднак абмяжоўваюць нас кадравыя магчымасці. Зараз дайшло нам арганізаванне турыстычнай дзейнасці ў гміне.

— Ёсць жа ў вас Рэпчыцкае вадасховішча і цікавая прырода. Як прадбачваеце разгарнуць турыстычную дзейнасць?

— У нашым цэнтры арганізуецца пункт турыстычнай інфармацыі, а ўжо і зараз можна даведацца аб турыстычных атракцыёнах у нашай гміне і шырэйшым наваколлі.

Хочам паставіць у нас інфакіёск, пры дапамозе якога турыст сам будзе шукаць інфармацыю аб цікавых яму аб'ектах і начлежнай базе. У нашым цэнтры будуць таксама начлежныя месцы. А зараз можна начаваць у агратурыстычных кватэрах у Сухавольцах і Дабрывадзе. Адкрываецца ў нашай гміне веласіпедная сцяжынка шляхам буслiных гнёздаў, якая з Кляшчэляў вядзе праз Паграбы, Жукі і Дашы. Купілі мы нават веласіпеды для пракату ўдзельнікам экскурсій.

— Ці апрача буслiных гнёздаў знаходзяцца на гэтым шляху іншыя атракцыёны?

— Шлях вядзе побач найстарэйшага ў нашай гміне лесу „Пухова", дзе адбылася бітва ў час шведскай вайны. Знаходзяцца там даўнія акопы і Шведская гара. Месца, дзе праходзіла змаганне са шведамі, па сённяшні дзень называецца Крывавым лугам. Па дарозе можна ўбачыць гнёзды розных птушак, цікавую расліннасць, месца, дзе водзяцца бабры, а ў Касной можна паглядзець Мікалаеўскую царкву XIX стагоддзя.

— Ці прадбачваецца пабудова турыстычнай базы побач Рэпчыцкага вадасховішча?

— Планы і праекты пабудовы турыстычнай інфраструктуры побач вадасховішча ўжо гатовы, але чакаем яшчэ грошай. Бурмістр чакае аб'яўлення адпаведнай еўрасаюзнай праграмы, каб атрымаць адтуль фінансавыя сродкі.

— Ваш цэнтр знаходзіцца ў прыгожа адрамантаваным будынку былой падставовай школы. Ці гэта даўні будынак?

— Будынак быў узведзены ў 1933 годзе і спачатку знаходзілася ў ім публічная паўшэхная школа. Пасля ў ім размяшчаліся сельскагаспадарчая, а затым прафесійная школы і зноў падставовая школа ажно да 1996 года, калі быў узведзены мураваны школьны будынак. З гэтага часу стары будынак нішчэў ажно да яго грунтоўнага рамонту з прызначэннем на Цэнтр турызму і культуры „Гладышка". З сектарнай аперацыйнай праграмы „Аднаўленне вёскі" мы атрымаем 450 тысяч злотых і далажылі свае сродкі. Аднак перабудова і аднаўленне будынка, з яго абсталяваннем, аказаліся настолькі капіталаёмкімі, што выдаткавалі мы намнога больш уласных сродкаў, чым планавалася разам каля 700 тысяч злотых.

— Кляшчэлі лічацца горадам, а карыстаецеся вясковымі сродкамі?

— Калі ў гміне, у якой знаходзіцца горад, жыве да 5 тысяч жыхароў, можна карыстацца многімі крыніцамі, у тым ліку па падтрымцы вясковых інвестыцый. Часта, каб атрымаць грошы з крыніц прызначаных на гарадскія інвестыцыі, трэба прадставіць планы намнога больш буйных інвестыцый, а мы такіх рэалізаваць у Кляшчэлях не зможам.

— Вы рашыліся вярнуць гарадскія правы, маючы на ўвазе багатую гісторыю?

— Кляшчэлі атрымалі гарадскія правы ў 1523 годзе і за намі сапраўды багатая гісторыя. У 1993 г. Кляшчэлям было вернута гарадское права.Гэта была ініцыятыва жыхароў, якія любяць быць мяшчанамі.

— Пра набліжэнне гісторыі і традыцыі клапоціцца таксама Таварыства сяброў Кляшчэлеўскай зямлі, з якім вы цесна супрацоўнічаеце.

— У супрацоўніцтве з таварыствам мы ладзілі праекты накіраваныя да вучняў і дарослых. Напрыклад, супрацоўнічалі мы пры збіранні матэрыялаў і выпуску мультымедыйнага кампакт-дыска „Як птушкі вяртаемся, каб шукаць старых гнёздаў", выдадзеную ў 2007 г. з нагоды 10-гадовага юбілею таварыства. На дыску прадстаўлена прыгажосць Кляшчэлеўскай зямлі.

Апошнім часам супольна з таварыствам рэалізавалі мы праект „Стань экскурсаводам па сваім наваколлі". Нашы жыхары вучыліся ладзіць экскурсіі па наваколлі і знаёміліся з атракцыёнамі, распаложанымі ў Гайнаўскім павеце.

— Дзякую за размову.

Гутарыў Аляксей МАРОЗ

У пошуках кантэкстаў

Мацей ХАЛАДОЎСКІ

— Палітычныя падзеі ў Беларусі (зрэшты, як і ў Расіі) ідуць у напрамку новага „культу асобы", і таму ў нас утвараюцца ўмовы, з аднаго боку, для адраджэння соц-арта, а з другога — для з'яўлення новага афіцыйнага мастацтва. Разам з тым, у Беларусі па-ранейшаму квітнее сацыялістычны рэалізм, які цяпер усведамляецца як вышэйшае дасягненне ўжо не агульнасавецкага, а менавіта беларускага мастацтва

Гэтак гаварыў у дакладзе ў час публічнай дыскусіі ў беластоцкай галерэі „Арсенал" Юрась Барысевіч, мінскі мастак і пісьменнік, член беларускіх авангардных мастацкіх згуртаванняў, між іншым Другога фронту мастацтваў. Гэтая сустрэча праводзілася пры нагодзе адкрыцця выставы „Беларускія перспектывы", аб якой пісалі мы тыдзень таму.

Юрась Барысевіч адзначыў:

— Па сутнасці сёння ў Беларусі няма ніводнай галерэі, якая спецыялізавалася б у эксперыментальным мастацтве, хоць яшчэ ў палове дзевяностых у Мінску было іх некалькі (лепшай была „Шостая лінія"). У Віцебску ўлада зачыніла найлепшую ў горадзе галерэю Алеся Пушкіна і арыштавалі самога мастака за тое, што наладзіў з'езд нацыяналістаў.

На думку Юрася Барысевіча, у пачатках дзевяностых у Беларусі расквітнелі радыкальныя авангардныя формы: перформенс, канкрэтная паэзія, інсталяцыі, эксперыменты з электроннай музыкай, жэставы тэатр:

— Але з пачаткам Чацвёртай сусветнай вайны (вайны з тэрарызмам) сітуацыя зноў змянілася. Тэракты і войны, навіны, якія мы штодня бачым, пазбавілі сэнсу крывавыя эксперыменты з уласным целам, што былі папулярныя ў маскоўскіх і беларускіх акцыяністаў.

Гаворачы пра сучаснае мастацтва ў Беларусі, Юрась Барысевіч шмат сказаў пра перформенс. Пры нагодзе ўспомніў аб вядомым у Еўропе штогадовым фестывалі перформенсаў „Навінкі", у якім прымалі ўдзел таксама польскія перформеры так, як дарэчы і ў тэатральным фестывалі „Мінская вясна":

— Гэта была акцыя салідарнасці з беларускімі калегамі, адрэзанымі ад культурнага жыцця Еўропы. У Беларусі канкурэнцыі для гэтага фестывалю няма, не лічыўшы акцый Другога фронту мастацтваў, якія абмяжоўваюцца да ўдзелу айчынных выканаўцаў. У „Навінках" традыцыйна палова ўдзельнікаў прадстаўляе нашу краіну, а другая палова — далёкае замежжа (гэта па-добраму вылучае фестываль ад мерапрыемстваў арганізаваных Міністэрствам культуры, якія прыпісваюць сабе гучны тытул „міжнародных", калі ў іх прымаюць удзел выканаўцы з Расіі і Украіны).

І дадаў:

— Асноўная тэма беларускіх перформенсаў — не змаганне з чарговым палітычным рэжымам, а экзістэнцыяльнае гуканне праўдзівага быцця, пошук выйсця за межы не толькі „сусветнага супермаркету", але і ўласнага цела. Перформенс (асабліва беларускі) заўсёды нейкім чынам закранае межы чалавечага існавання: нараджэнне, смерць, уваскрашэнне, роды, аборт ці псіхадэлічныя падарожжы свядомасці. Найперш, зразумела, маюцца на ўвазе межы экзістэнцыі аўтара, але аб'ектам эксперымента можа быць і аўдыторыя.

Фота Ганны Кандрацюк

На адкрыцці выстаўкі выступае Моніка Шэўчык, дырэктар галерэі „Арсенал"

Адзначыў таксама:

— Для перформенсу ў Беларусі неабходнай з'яўляецца грамадска-культурная інфраструктура.

У сваю чаргу малады перформер з Мінска Аляксей Фёдараў, які з'яўляецца праціўнікам формулы фестывалю „Навінкі", а які паказаў свой перформенс у час вернісажу „Беларускіх перспектыў", сказаў у размове з „Нівай":

— На маю думку перформенс павінен радыкальна праяўляцца ў сваёй форме, кранаць гледача. Павінен кранаць і палітычны ды сацыяльны кантэкст. Ён выключна як аўтарскае выяўленне — малацікавы. У Беларусі перфомерам былі створаны рамкі прыстойнасці. Самі аўтары баяцца пайсці надта далёка.

Пры нагодзе дадаў:

— На выставе „Беларускія перспектывы" — гэта ніякія не перспектывы, але паказана тое, што можна было пабачыць ужо дзесяць-пятнаццаць гадоў таму.

Раней, у час даклада Юрась Барысевіч тлумачыў:

— Магчыма, засяроджанасць на экзістэнцыяльнай праблематыцы вынікае з няўпэўненасці ў тым, ці з'яўляецца беларуская культура паўнавартаснай прасторай для творчай самарэалізацыі і ці існуе ўвогуле такая краіна — Беларусь. Зрэшты, сёння ніхто не можа быць упэўнены, што свет, у якім мы жывем, яшчэ не стаўся адным з файлаў віртуальнай рэальнасці.

У час публічнай дыскусіі Артур Клінаў, адзін з куратараў выставы ў „Арсенале", кіраўнік Беларускага саюза сучаснага мастацтва, успамінаючы аб адной з рэдакцыйных дэбат і спасылаючыся на кандыцыю мастацтва ў Беларусі, сказаў:

— Беларусь павісла паміж горадам і вёскай. Партызанка (шырокая ўява) гэта на сёння адзіны шлях да ўтрымання беларускай культуры. Іншы шлях гэта паўтор існуючых думак і форм, утрымліванне „васковых фігур".

Прытым адзначыў з непрыхаванай горыччу:

— У Мінску сёння няма ні аднае галерэі.

Тут са сваёй думкай уключыўся Лявон Тарасэвіч, сусветнай вядомасці мастак з Валіл:

— У Польшчы няма таксама галерэй.

Гэтая заява ўзбударажыла слухачоў, асабліва з ліку кіраўніцтва галерэі „Арсенал". Лявон Тарасэвіч пастараўся растлумачыць:

— „Арсенал" гэта гарадская ўстанова, у якой паказваюцца прызнаныя працы, а не прамуюцца.

Артур Клінаў:

— У Беларусі няма не толькі галерэй, але і інфраструктуры для сучаснага мастацтва. Ёсць Музей сучаснага мастацтва. Гэта аднак толькі ілюзія. Таму працягваецца індывідуальная партызанка мастакоў без заплечча ўстаноў. Кожны мастак у нас сам сабе галернікам; майстэрня з'яўляецца галерэяй, у якой ствараюцца, прамуюцца і прадаюцца працы.

Лявон Тарасэвіч:

— Заўсёды, калі пачынае штосьці актывізавацца, паяўляецца паліцыйная сістэма. Вось прыклад. У Гарадку ставіцца „Сяброўская бяседа" з удзелам пасла Беларусі ў Польшчы супраць „Басовішчаў". Кожная інтэлектуальная праява будзе знішчацца кожным рэжымам.

Пасля дакінуў:

— Беларусь — гэта апошні музей савецкага свету, таму што дзяржава ўтрымлівае гэтую ілюзію.

Артур Клінаў:

— Жыццё ў Беларусі было правінцыйнае, але з гэтага выходзіць, працягваецца працэс усведамляння сваёй нацыянальнасці. Мінск не больш правінцыйны ад эміграцыі. Гэта выраўнуецца канчаткова праз пяць-дзесяць гадоў.

Лявон Тарасэвіч:

— Межы гэтых падзелаў — фіктыўныя. Не трэба сядзець у Беларусі і, выязджаючы за мяжу, паказваць сябе пакутнікам, як робяць гэта хоць бы некаторыя беларускія рокмены.

Артур Клінаў:

— Нашы аўтары працуюць у еўрапейскім кантэксце і тут нашы пункты адносін, але не з'яўляецца гэта беларускай перспектывай сапхнутай да ўявы беларушчыны.

У Нарваўскай гміне

Найпрыгажэйшай вёскай у Нарваўскай гміне з'яўляецца Ласінка. А гэта таму, што калісь быў старшынёй рады гміны спадар Сцяпан Кучынскі, лекар, які працаваў у вясковым асяродку здароўя ў Ласінцы. Гэта ён пахадайнічаў давесці туды ваду і пабудаваў вясковую ачышчальню сцёкаў. Тады пры дапамозе Сцяпана Кучынскага асфальтавалі вуліцу, паклалі з абодвух бакоў вуліцы тратуары. У той час сама Нарва не мела яшчэ ачышчальні, а выезд толькі да Ласінкі ад усходняга боку быў асфальтаваны. Калі закрылі вясковы асяродак здароўя ў Ласінцы, а лекар спадар Сцяпан Кучынскі прыйшоў на працу ў Гмінны асяродак здароўя ў Нарву як кіраўнік, шмат хто з ласінцаў забыўся пра тое, што ён зрабіў для іхняй вёскі. Цяпер спадар Кучынскі з'яўляецца павятовым радным ад Нарваўскай гміны ў Гайнаўцы і дбае пра ўсю гміну. Толькі што аднаму цяжка што-небудзь адваяваць у паверце для Нарваўскай гміны.

Цяпер старшынёй Рады Нарваўскай гміны з'яўляецца спадар Яўген Дудзіч, настаўнік у гміннай школе ў Нарве, і ён стараецца як найбольш зрабіць для свае вёскі Ласінкі, у якой пастаянна пражывае. Здаецца, менш ён глядзіць на вёскі, што распаложаны на правым баку ракі Нарвы. Гэтыя вёскі ў нас найбольш занядбаныя. Здаецца, што і войта Нарваўскай гміны, Якуба Садоўскага, ураджэнца Тыневіч-Вялікіх, што распаложаны на левым баку ракі Нарвы, таксама больш „цягне" на свой бераг.

Ужо мінула палова склікання рады гміны і тут трэба прыглядзецца, што варта было б зрабіць для жыхароў і з правага берага ракі Нарвы. Добра было б палепшыць жыццё ўсім жыхарам гміны!

Мікалай ЛУК'ЯНЮК

Як не кіем, дык палкай...

Яблыкі сёлета абрадзілі. Садаўнікі клапоцяцца аб збыце , бо шмат фруктаў абсыпаецца і няма дзе з імі падзецца. Перапрацовачныя фірмы прапануюць нізкія цэны, садаўнікі пратэстуюць. Дапамінаюцца прынамсі 35 грошаў за кілаграм, што хаця трохі кампенсавала б іхнія выдаткі.

На вёсцы сяляне ападаючыя фрукты скормяць жывёлай. У каго яе няма, дык фрукты пагніюць пад дрэвамі або на сметніцу выкінуць. Некалькі год таму па вёсках на аўтамабілі ездзілі скупшчыкі і „спады" куплялі. Плацілі па 10 грошаў за кілаграм і людзі ахвотна іх прадавалі. Невялікі ад таго прыбытак быў, але садавіна не марнавалася. Зараз і ад таго адракаюцца. У рыначнай эканоміцы, відаць, надта малы гэта бізнес, каб ім займацца. Селяніну заўсёды вецер у вочы. Кепска, як мароз квецень замарозіць, ды і ад вялікага ўраджаю няма карысці. Як не кіем, дык палкай атрымае... па кішэні.

(ус)

Ганна Кандрацюк (zorka@niva.iig.pl)

зорка

для дзяцей і моладзі

Віктар ШВЕД

ПОЎНАЯ ХАТА ЭКСПАНАТАЎ

Помню дзеда хату,
Поўную экспанатаў:
З карэнняў калыска,
Гліняная міска,
Драўляная лыжка,
Даўная гладышка,
Святыя іконы,
Круглы серп зублёны,
Вялікія кросны,
Кадаўбец дзівосны,
Каменныя жорны,
Дзяжа на хлеб чорны,
Стары калаўротак,
Са сноўніцай мотак,
Гладкая качалка,
Крэсіва-запалкі...
У нябыце хата
І ўсе экспанаты.

Фота Ганны Кандрацюк

Ганна Кандрацюк, настаўніца з Нараўкі з пачатковай версіяй кніжкі-буклета

Слоўнік старых прадметаў Белавежскай пушчы

Нядаўна я пачула дзіўную размову сярод беластоцкіх знаёмых. Яны не маглі перажыць страты старога цэпа. Прылада цягам доўгіх гадоў вісела ў старэнькай стадоле ў вёсцы, адкуль паходзіў гаспадар. Ніхто ёю не карыстаўся, не браў у рукі, не цікавіўся. Недзе дзесяць гадоў таму стары цэп пазычыў іх вясковы сусед. Пра гэта таксама спачатку забыліся мае беластоцкія знаёмыя. Аднак нядаўна яны схадзілі да суседа і пачалі дамагацца, каб вярнуў ім каштоўную памятку.

— Я даўно ўжо спаліў ваш цэп! — у адказ дзядзька толькі пацісну плячыма.

Мае знаёмыя, вядома, не паверылі вясковаму круцялю. Хто нармальны будзе рубаць цэп на дровы? Гэта смешна! Яны прыгадалі сабе, як тры гады таму ў іх вёску прыехалі турысты з Нямеччыны. Немцы куплялі ўсе старыя драўляныя прадметы: калаўроткі, маслабойкі, капанькі, цэбрыкі, дзежкі....

— Відаць і наш цэп паехаў у Нямеччыну, — мяркуюць зараз мае гарадскія знаёмыя. Мне смешна, што той цэп пачалі цаніць толькі пасля яго страты. Падумаеце — свет звар'яцеў! Старыя прадметы сталі набываць турысты з найбольш развітых у галіне тэхналогіі краін Еўропы.

Сутнасць у моцы старых прадметаў. Яны не толькі напамінаюць пра мінулае жыццё. У іх мы адчытаем кшталт і смак жыцця продкаў, іх вынаходлівасць, пачуццё прыгажосці і цану функцыянальнасці. У іх мы знойдзем інфармацыю пра сябе, пра свой культурны і гістарычны код. Таму кніжку-буклет Ганны Кандрацюк *Поўна хата экспанатаў* мы прывіталі як найлепшы падарунак нашым вучням у пачатку школьнага навучальнага года. На 111 старонках паказаны прылады зробленыя ўручную. Аўтарка адшукала іх у нашых падляшскіх хатах: у Дубінах, у Новым Беразове, Міклашэве, Студзіводах, Белавежы. Аднак найбольш прадметаў з пушчанскіх хат Нараўчанскай гміны. Іх пазбіралі вучні Ганны Кандрацюк, з якімі настаўніца ладзіла этнаграфічны інтэр'ер у кабінеце беларускай мовы ў Нараўцы.

— Аналізуючы літаратурныя тэксты, не раз прыходзіцца спасылацца на мінулыя часы, — піша ва ўступным слове аўтарка кніжкі. — Тады з'яўляецца праблема, у які спосаб можна вобразна і коратка расказаць пра нейкую рэч, якой яны ніколі не бачылі. Апрача экспанатаў, якія ёсць у рэгіянальным куточку ў класе, іншых дапаможных матэрыялаў у гэтай галіне настаўнік не мае. Гэта было штуршком для таго, каб быў створаны гэты буклет. Яго галоўная мэта: зацікавіць роднай мовай, нацыянальнай культурай, спадчынай нашых продкаў.

Тэма этнаграфічных прылад даволі шырока насветлена ў навучальных праграмах беларускай мовы. Пра гэта добра ведаюць удзельнікі прадметных конкурсаў. У мінулым годзе, напрыклад, трэба было вывучыць усе прылады звязаныя з апрацоўкай ільну... Колькі было цяжкасцей і хвалявання!

„Поўна хата экспанатаў" — дапаможнік вытрыманы ў густоўнай эстэтыцы. Здымкі ў выкананні Валянціна і Марціна Кандрацюкоў проста захапляюць (Марцін — першы лаўрэат фотаконкурсу „Зоркі" „Беларус ў Еўрасаюзе). Побач кожнай прылады падаецца інфармацыя на беларускай і польскай мовах. Каштоўнасць тэксту заключаецца і ў тым, што апрача энцыклапедычных звестак ён папоўнены інфармацыямі з размоў з мясцовымі старажыламі. Сама гісторыя буклета даволі складаная і цікавая. Спачатку ён быў падуманы як дапаможнік (у некалькіх экземплярах) для нараўчанскіх вучняў. На шчасце яго пабачыла Наталля Герасімюк, якая зрабіла ўсё, каб кніжка выйшла ў друку і служыла ўсім нашым навучэнцам. Як пабачыць сам чытач-глядач, „Таварыства аховы краявіду" — выдавец кніжкі, не падвёў!

— Малайцы Вы! Нават у Беларусі няма такой кніжкі, — захапляліся выданнем ніўскія госці з Беларусі.

ЗОРКА

Ганна Кандрацюк, *Поўна хата экспанатаў*, Таварыства аховы краявіду (ТАК), 2008

Міра ЛУКША

Лебедзь з Лебедзіна

Ці калісьці быў такі я,
як цяпер, з сагнутай шыяй,
што, як светлы лук у вадзе
сам з сабой дыялог вядзе?
Ой, калісь я быў маленькі,
і мурзаты, і дурненькі,
думаў: брыдкі, нецікавы
ды клыпасты, бы кульгавы...
Нават качка, дык і тая
ножкамі перабірае
(хоць ківаецца на бокі! —
ці хто браць яе ў скокі
ўсё ж захоча?). А мяне?!
Хоць не ўбач у кашмарным сне!

А цяпер я — царскі птах!
Запрашаю ў водны шлях!
І жадаю ўсім малым:
Не глядзіце вы зусім,
што, здаецца, неўдалоткі!
Прыйдзе і ваш дзень салодкі,
калі з пташкі стане птаха
ў снежна-белых апранахах!

Фота Ганны Кандрацюк

Школьнікі з Нарвы наведалі „Рацыю"

ГІСТОРЫЯ ПРА ЧАКАННЕ І ЭНЭРГІЮ ВОСЕНЬСКІХ ДРЭЎ

А гэтую гісторыю мне нашапталі..., не, не сарамлівыя вусны дзяўчыны з пранізліва-жоўтага верасня і не гожага юнака, які ў тым верасні заблукаў, нібы ў вачах дзяўчыны. Яе расказалі дубовыя разныя лісты, што трымаюцца яшчэ моцна, але паціху — ападаюць, ападаюць... Прачытаў яе ў блакітнай глыбіні высокага неба, дзе белыя, пяшчотныя радкі засталіся дрогкімі аблачынкамі. Напаткаў яе сярод зарападу чырвоных рабін, што мяшаюцца з мятнаю, вечароваю прахалодаю.

Толькі ўсё роўна: тая гісторыя — праз сонца ўзгаданых пра неразлучных юнака і дзяўчыну. Так, яны былі неразлучныя; іх рукі спляталіся, нібы цёплыя струменьчыкі вераснёўскіх ціхіх дажджоў, да той самай пары, пакуль ён — не паехаў. Што ж, так часта бывае: доўжыцца прыгожае і непаўторнае, пакуль хтосьці з нас — не з'язджае. І таму, хто застаецца, — заўсёды цяжэй. І ты жывеш з гэтым, і спрабуеш нешта рабіць, каб не так балюча і кранальна — згадкі, шолахі, успаміны...

І, каб не так, — дзяўчына штовечар прыходзіла ў парк. Басаногі сярод высахлае травы, асцярожна, каб ніхто не пачуў: знаходзіла — сваё дрэва. Выбачайце, памыліўся: іхняе дрэва.

Ніхто, ні адзіная душа ва ўсім свеце, не ведаў што рабіла яна там. Якія словы заставаліся назаўсёды ў дубовых маўклівых галінах, якія шэпты знікалі сярод шэрай кары, вітражнага лісця, палымнеючай кроны. А можа.., і не было там ніякіх шэптаў? Можа, толькі няўлоўную ўсмешку маўчання чуў прыцішаны ветрык, пакідаючы парку свае пацалункі?..

І зноў быў вечар; і верасень дарыў сонцу свае апошнія дні. І зноў знайшла стромкае дрэва, бархотны дубочак дзяўчына. Яна стала, як станавілася гэтыя дні: да яго спінаю, завяла назад рукі ды абшчапіла імі стваліну. Невядомая энергія пружыніста-прыроднай магутнасці палілася павуцінкамі па ейнаму суму, па ейнаму пругкаму целу, як раптам... Знаёмыя пальцы, знаёмы пяшчотны электраток працяў залацістае сэрца, поўную нерастрачанасці душу дзяўчыны.

— Прывітанне! А я і не бачыў цябе, — пачулася з іншага боку дрэва. І парк загучаў пранікнёнай, адчайнай, самай чароўнай музыкай.

— Я цябе таксама, — адказала яна, ці чуючы тую музыку, невядома?..

— А ты ведаеш?

— Што?..

— Я... кахаю цябе.

— І я. Кахаю цябе таксама.

А парк гучаў і гучаў. Той жа музыкай. І ўсё тымі ж дрэвамі.

Ваш Дзядзечка Сід

7 верасня 2008 г., Кобрын

Музыка з кайфам

Стары новы „Народны альбом"

Для мяне вельмі важным стаў 1998 год. Тады ўпершыню я, свядома, паехала ў Венгрыю, пачала цікавіцца мовай ды культурай. На другім полюсе была беларускасць, якую ўзмоцніў пяты выпуск фестывалю „Бардаўская восень". Па розных прычынах было гэта незабыўнае мерапрыемства, аднак найважнейшай падзеяй здаецца мне польская прэм'ера праекта „Народны альбом".

http://www.step.lua.pl/

Саша Памідораў

„Народны альбом" запісаны быў у Мінску ў 1997 годзе. Тады ў снежні і адбылася першая прэзентацыя праекта, а год пазней — у Польшчы. Пішу пра гэты праект па прычыне апошняй яго прэзентацыі ў Беластоку 7 верасня 2008 г. Зусім нядаўна, але колькі з гэтым звязана эмоцый. Я не бачыла праекта з 1998 года, таму перш за ўсё хацелася пабачыць ці ўсе музыкі паявяцца на сцэне. Усіх не было, але галоўныя героі наведалі Беласток. Пазітыўны энергіі шмат, але гэта напэўна іншая энергія, чым у першых гадах існавання праекта.

Хаця без зорак у асобах Лявона Вольскага, Аляксандра Памідорава ці Касі Камоцкай цяжка сабе ўявіць гэты „супольны музычны праект", то папраўдзе не з'явіўся б ён, каб не яго аўтар — Міхал Анемпадыстаў, якога часта можна сустрэць у ролі канферансье. Ён з'яўляецца аўтарам тэкстаў — тым, які падбіраў ужо існуючыя і апрацоўваў іх. У альбоме знойдзем дзве народныя песні: „Надзенька" і „Lomir zech iberbetn" — гэтую другую ў цудоўным касцюме выконвае Саша Памідораў. Цяжка пералічыць круг людзей, якія спрычыніліся да заіснавання альбома, а яшчэ цяжэй пералічыць кола фанатаў праекта. Большасць з нас ведае ўсе тэксты, спявае іх на канцэртах, пры розных нагодах, а падляшскім гімнам сталі „Простыя словы" — апошняя песня альбома. Вельмі важна, што артысты стараюцца адсвежыць кожны свой выступ, таму цікава слухаць гэты праект ужывую.

http://www.step.lua.pl/

Вераніка Круглава

У гэтым годзе спаўняецца 10 гадоў ад бельскай прэм'еры «Супольнага музычнага праекта „Народны альбом"» і ўсе знакі прадвяшчаюць, што ў кастрычніку „Народны альбом" зноўку пабачым у Бельску-Падляшскім. Тады рыхтуйцеся на новыя ўражанні і ўжо прасіце бацькоў ды настаўнікаў беларускай мовы, каб узялі вас у Бельск-Падляшскі паглядзець і паслухаць „Народны альбом".

i_basovka@o2.pl

Польска-беларуская крыжаванка № 38

Запоўніце клеткі беларускімі словамі. Адказы, з наклееным кантрольным талонам, на працягу трох тыдняў дашліце ў „Зорку". Тут разыграем цікавыя ўзнагароды.

Адказ на крыжаванку № 34:

Душ, ружа, мак, шаман, гоман, Б.Н., калыханка, госці, я. Нага, колас, мы, ша, ранак, шум, жабка, ванна.



XXVIII Сустрэча беларусаў замежжа

Цішка ДЗЕНІСЮК

30-31 жніўня 2008 г. у беларускім грамадскім цэнтры „Полацак", што ў амерыканскім Стронгсвіле недалёка ад Кліўленда, прайшла XXVIII Сустрэча беларусаў Паўночнай Амерыкі. Прыняло ў ёй удзел больш за дзве сотні беларусаў Злучаных Штатаў, Канады, Англіі ды самой Беларусі.

Арганізатарамі сустрэчы выступілі Беларускае задзіночанне Амерыкі (БАЗА), Згуртаванне беларусаў Канады ды Беларуска-Амерыканскі грамадскі цэнтр „Полацак".

Пераважная большасць удзельнікаў сустрэчы прыехала на ўласных аўто. Сарганізаваная ды самая вялікая група, складзеная з жыхароў Нью-Йорка ды Нью-Джэрсі завітала ў Моцны Гарадок (менавіта так перакладаецца назва Стронгсвіл з англійскай мовы) на аўтобусе, пераадолеўшы няблізкі, больш чым 600-кіламетровы ды 9-гадзінны шлях. Былі і тыя, хто завітаў у мястэчка, скарыстаўшыся паслугамі авіяліній: беларусы прыляцелі з Каліфорніі, Лас-Вегаса, Англіі. Наогул беларусы на Сустрэчу з'ехаліся больш чым з дваццаці рэгіёнаў Злучаных Штатаў, Канады ды Вялікабрытаніі.

Хочацца адзначыць брытанскага прадстаўніка асабіста. Ім быў вядомы беларускі дзеяч айцец Аляксандр Надсан з Лондана.

Ну а самы доўгі шлях, каб патрапіць на сустрэчу, адолелі прадстаўнікі такой далёкай — каля 10 тысяч кіламетраў — і ў той жа час зусім блізкай, што жыве ў сэрцы кожнага з нас, Беларусі.

Трэба нагадаць, што беларусы Амерыкі ўпершыню ладзілі такую сустрэчу 56 год назад — у далёкім 1952 годзе.

У першы дзень адбыўся кірмаш, на якім наведвальнікі мелі магчымасць набыць кашулі, капелюшы, посуд, народныя вырабы ды іншыя прыналежнасці з выявамі вядомых беларускіх асоб, з гістарычнымі беларускімі сімваламі ды ў нацыянальных колерах.

У валейбольным турніры, у якім удзельнічалі 6 каманд, перамогу атрымала добра падрыхтаваная да спаборніцтваў „зборная Канады".

Вечарам беларусы частаваліся традыцыйнымі беларускімі прысмакамі, слухалі музыку маладых беларускіх рок-выканаўцаў ды спявалі пад гармонік. Таксама былі паказаны стужка „Беларускі Рэзыстанс", зробленая беларусамі Польшчы, якія дакументальна прааналізавалі антысавецкі супраціў, ды вядомы фільм Юрыя Хашчавацкага „Плошча", у якім аўтар распавёў пра падзеі апошняй прэзідэнцкай кампаніі ды гераічныя спробы маладых беларусаў вярнуць Беларусь на цывілізаваны шлях развіцця.

Другі дзень распачаўся ранішняй багаслужбай. Афіцыйнае адкрыццё Сустрэчы адбылося пасля абеду. Спадар Вячка Станкевіч вітаў кожны рэгіён, які прадстаўлялі беларусы. Найбольшае прадстаўніцтва было ў канадскай правінцыі Антарыо ды амерыканскіх штатаў Нью-Йорк і Нью-Джэрсі.

Першай удзельнікаў вітала старшыня Рады БНР Івонка Сурвіла. У сваім выступе яна коратка распавяла пра праблемы, якія стаяць перад дыяспарай, адзначыла ролю беларускай эміграцыі ў станаўленні вольнай Беларусі: „Цяперашнія беларускія амбасадары прадстаўляюць Лукашэнку. А беларускі народ прадстаўляе дыяспара!" Звярнула яна ўвагу і на тое, што зараз шмат хто з беларусаў спрабуюць заставацца па-за палітыкай: „Палітыка — гэта тое, што мы робім. Але палітыка — гэта і тое, чаго мы не робім. А гэта яшчэ значна горш!"

Выканаўчы дырэктар Цэнтра беларускіх доследаў пры Паўднёва-заходнім каледжы, што ў Канзасе, былы амерыканскі амбасадар на Беларусі ў 1992-1994 гадах Дэвід Суорц у сваім насычаным 8-хвілінным выступе распавёў пра вельмі істотныя падзеі апошняга часу, што датычацца Беларусі. Ён выказаў свой погляд на расейска-грузінскі ваенны канфлікт, ды распавёў пра адны з першых яго паслядоўнасцей — падпісаныя дамовы паміж ЗША, Польшчай ды Чэхіяй аб пачатку ўсталявання сістэм супрацьпаветранай абароны.

Зянон Пазьняк і Валянціна Трыгубовіч

Івонка Сурвіла

Як адзін з кіраўнікоў Цэнтра беларускіх доследаў, спадар Суорц з жалем зазначыў, што на сённяшні дзень беларусы ў адрозненне ад, напрыклад, чэхаў не маюць свайго персанальнага месца на амерыканскай зямлі, якое ведалі б не толькі ўсе беларусы, але і амерыканцы ды жыхары іншых краін свету, і куды яны б мелі магчымасць прыехаць і пазнаёміцца з нацыянальнай гісторыяй, культурай, мастацтвам, з жыццёвым укладам, сустрэцца з носьбітамі гэтых каштоўнасцей. І таму гэты накірунак працы — адзін з асноўных на бліжэйшыя гады. Праграма па пошуку ды выбіранні перспектыўных беларусаў для навучання на амерыканскай зямлі дзеля будучай працы для спраў беларушчыны на Радзіме — адзін з асноўных накірункаў дзейнасці Цэнтра беларускіх доследаў. Больш падрабязна пра яго можна даведацца на вэб-старонцы www.sckans.edu/belarus.

Пасля выступу спадара Суорца былі зачытаны вітальныя словы ад кіраўніка Беларускай праваслаўнай царквы, мітрапаліта Слуцкага Філарэта, а таксама ад грамадска-асветніцкага аб'яднання „Спадчына".

Падчас невялічкага 15-хвіліннага перапынку ўдзельнікі сустрэчы мелі магчымасць набыць беларускія кніжкі, пазнаёміцца з творамі пяці беларускіх мастакоў ды пачаставацца беларускамі прысмакамі.

Канферэнцыя на тэму „Год беларускай дзяржаўнасці", мадэратарам якой быў старшыня БАЗА Віталь Зайка, пачалася з выступу старшыні таварыства „Бацькаўшчына" Алены Макоўскай. Яна распавяла пра дзейнасць аб'яднання за апошні год, зладжаныя таварыствам у апошні час акцыі, бягучыя ды будучыя праекты. Адзін з галоўных ды перспектыўных накірункаў на бліжэйшы час — гэта працяг праекта „Год беларускай дзяржаўнасці". Але калі раней ён ладзіўся больш у палітычных мэтах, то зараз асноўны яго накірунак будзе мець культурна-адукацыйныя межы.

Алена Макоўская закранула таксама праблему масавага ад'езду моладзі з Беларусі, большасць з якой для краіны папросту губляецца, бо пераважная частка маладых людзей не з'яўляюцца носьбітамі беларускай мовы ды культуры. „А іх веды вельмі спатрэбіліся б Беларусі ў будучыні!", — абагуліла праблему Алена Макоўская ды запрасіла ўсіх прысутных прыняць удзел у штогадовым з'ездзе „Бацькаўшчыны".

Выступ Валянціны Трыгубовіч — лідаркі праваслаўнага беларускага руху датычыўся па большасці рэлігійных пытанняў ды спроб беларусаў змяніць сітуацыю да лепшага ў гэтай духоўнай частцы жыцця краіны. Яна распавяла пра невялікія перамогі, якіх дамагліся вернікі на Беларусі ў апошні час, а таксама, на жаль, пра вялікую колькасць нявырашаных праблемаў, што паўсталі перад беларусамі ды ныюць болем у тысячах сэрцаў нашых суайчыннікаў. Чаму так адбываецца? Магчыма, адказ на гэтае пытанне можна прывесці першымі словамі Валянціны ў яе выступе: „Да шчасця, калі я прыязджаю сюды — а я тут ужо пяты раз — я заўсёды бачу шмат новых твараў. Але, на жаль, так адбываецца, што я не сустракаю знаёмых твараў ды сяброў". Вельмі трапна сказала спадарыня Валянціна! Адсутнасць салідарнасці, пачуцця сяброўскага пляча побач ды разрозненасць беларусаў — адны з галоўных праблем нацыі на шляху да вольнай краіны.

І ўсё ж ёсць пераможны рэцэпт: „Трэба самому змагацца за сваю веру! Але не змагацца супраць іншага!"

Наша Беларусь і беларуская мова — гэта тая вера, за якую змагаецца Валянціна Трыгубовіч ды яе паплечнікі і тое, што яднае ўсіх беларусаў свету.

Малады гісторык, студэнт Нью-Йоркскага ўніверсітэта Ілья Куніцкі ў сваім выступе распавёў пра ўсе стадыі беларускай дзяржаўнасці: ад полацкіх князёў ды Вялікага Княства Літоўскага да з'яўлення Беларускай Народнай Рэспублікі ды нарэшце самастойнай, прызнанай усімі краінамі свету дзяржавы з назвай Рэспубліка Беларусь.

Цікавымі для аўдыторыі былі і развагі Ілы пра нацыянальнае пытанне ў дачыненні да дзяржаўнасці. Так, ужо бачна, што вялікія шматнацыянальныя дзяржавы-імперыі саступілі месца ў сучасным свеце нацыянальным адзінкам. Але, па словах Ілы, шмат хто зараз пачынае казаць ужо і пра заняпад такіх нацыянальных дзяржаў, якія знаходзяцца пад уціскам глабалізацыі свету. Нягледзячы на гэты ціск ды на тое, што „цяперашняя беларуская ўлада робіць усё насуперак нацыянальным інтарэсам, Беларусі трэба кіравацца сваімі нацыянальнымі інтарэсамі і разлічваць выключна на самую сябе", — заключыў спадар Куніцкі.

Апошнім з выступоўцаў узяў слова старшыня Кансерватыўна-Хрысціянскай партыі БНФ Зянон Пазьняк. Яго прамова датычылася сучаснай сітуацыі на Беларусі ды яе перспектыў. Стасункі Беларусі з Расіяй сталі галоўным накірункам прамовы былога кандыдата ў прэзідэнты краіны.

Гістарычны ракурс ацэнкі цяперашніх падзей толькі дадаў колеру выступу. 300-гадовы ціск першых людзей усходняй краіны з планам, які ў дачыненні Расіі да Беларусі гучыць як некалі рымскі „Карфаген павінен быць разбураны", зараз прыводзіць да вельмі небяспечнага становішча для нашай краіны. Большай небяспекі сітуацыі на Беларусі дадае знаходжанне на пасадзе кіраўніка дзяржавы прарасейскага палітыка.

Ваенны канфлікт Расіі і Грузіі — яшчэ адзін са шматлікіх доказаў накіраванасці нашай усходняй суседкі да экстэнсіўна-збройнага развіцця краіны. І гэтая вайна — як дэманстрацыя ўсяму свету гэтага светапогляду, падмурак якому заклалі ўсе маскоўскія цары ды імператары, называючы сваю краіну ваеннай дзяржавай.

Віток гісторыі ў супрацьстаянні беларускіх нацыянальных інтарэсаў прарасейскай палітыцы выйшаў на новы ўзровень, па словах Зянона Пазьняка, напрыканцы 2005 года. Якраз у той час стала відавочнай спроба Расіі захапіць працяг ☞ 9

„Зніч” на Беласточчыне

Тэкст і фота Міры ЛУКШЫ

На запрашэнне Генконсульства Рэспублікі Беларусь у Беластоку, у рамках праграмы „Беларусы ў Польшчы”, наведаў Беласточчыну са спектаклямі для дзяцей і дарослых мінскі паэтычны тэатр аднаго акцёра „Зніч” Дзяржфілармоніі.

— Вельмі прыемна ўбачыцца з вамі ўжо другі раз у гэтым сезоне, паколькі паказвалі мы леташняй восенню свой монаспактакль „Пачакай, сонца”, — сказала дырэктар, рэжысёр і актрыса Галіна Дзягілева. — Мы вельмі ўдзячны перш за ўсё Міхалу Васільевічу Аляксейчыку, генконсулу Беларусі ў Беластоку, які дае нам магчымасць падзяліцца нашымі дасягненнямі перш за ўсё з беларусамі Беласточчыны. Ініцыятыва была генконсула, Міхал Васільевіч ведае наш рэпертуар, і ён адабраў загалоўкі спектакляў. Дарэчы, Міхал Васільевіч не проста генконсул, ён робіць місію, а робіць гэта па максімуму, каб адрэкамендаваць беларускую культуру. І для нашага тэатра гэта вельмі каштоўныя сустрэчы. І гледачы — незвычайныя. Вось дзеці — якое ў іх выхаванне, якая цікаўнасць да культуры!

З тэатрам „Зніч” (ягоная сядзіба — праспект Перамогі, 50, у Чырвоным (св. Алены і Сымона) касцёле) супрацоўнічаюць акцёры з Тэатра юнага гледача, з тэатра кінаакцёра, з Рускага тэатра, а таксама філармонікі.

— Мы паставілі 17 спектакляў, у тым ліку 5 дзіцячых. Беларускім дзеткам прывезлі мы лялечны спектакль „Пра ката Сафрона і пеўніка Андрона” Лявона Мікіты, у якім іграе ролю Лёня Сідарэвіч, у рэжысуры Галіны Карбаўнічай, у мастацкім афармленні Таццяны Карбаўнічай. Спектакль „Мой маленькі прынц” пастаўлены як бы ад імя Кансуэлы, жонкі Антуана Сент-Экзюперы, якую аўтар увасобіў у сваім творы як ружу (Антуан з Кансуэлай разам стварылі твор). „Прынц” у перакладзе Ніны Мацяш, у спектаклі гучыць музыка Яўгена Глебава (з балета „Маленькі прынц”) і Радзівона Глебава, ролю іграе сёння Раіса Астрадзінава з Тэатра юнага гледача. У Бельску паказаны будзе і „Мой маленькі анёлак” — філасофская казка паводле вершаў Кармен дэ Гаштольд (французскай манахіні, дзіцячай пісьменніцы, якой продкі валодалі беларускімі мястэчкамі) — п’еса Сяргея Кавалёва, якой герой з’яўляецца апекуном забытых звяроў: Бог спусціў яго на зямлю знайсці найбольш няшчасную істоту. У Бельску паказана будзе таксама п’еса паводле „Новай зямлі” Якуба Коласа. І перш за ўсё — першая нацыянальная монаопера „Адзінокі птах”, якая ідзе ў нас ужо не адзін сезон. У монаоперы задзейнічалі вялікія сілы. Напісаў яе кампазітар Алег Залётнеў. У нашым тэатры адбылася пастаноўка ў 2001 годзе, на вялікай філарманічнай сцэне, задзейнічалі былі сімфанічны аркестр, вялікая музычная капэла, дзяржаўны камерны хор. Мара паставіць гэты спектакль была ў нашым тэатры з 1993 года. Цяпер монаопера працягвае сваё жыццё на нашай камернай сцэне, але надараецца нам яе прадстаўляць і ў вялікіх тэатрах, паколькі гэты твор гэта вытрымлівае. Аўтарам лібрэта і рэжысёрам-пастаноўшчыкам з’яўляюся я, зараз у спектаклі ўдзельнічае саліст оперы, выканаўца монаоперы, лаўрэат міжнародных конкурсаў Андрэй Марозаў. Паглыбімся разам у асенні дзень 1855 года, калі прыехаў у Стамбул з місіяй ваеннага сакратара Адам Міцкевіч. І ўсё жыццё марыў пра сваю айчыну ды імкнуўся вярнуцца на радзіму. Ён захварэў у гэты дзень халерай. І пераходзіць тут перад намі ў сюжэце монаоперы ўсё яго жыццё. Адбываецца своесасаблівая літургія, спавяданне яго душы. Ёсць тут і малітва да Маці Божай Вострабрамскай, якая лучыць успаміны з маленства і юнацтва...

— І Ваш, вельмі Ваш, монаспектакль „Пачакай, сонца”, якога з’яўляецеся і рэжысёрам разам з Максімам Сохарам, і якога лібрэта склалі Вы паводле санетаў Ніны Мацяш, яе перакладаў з заходніх літаратур і гісторыі Ліны Кастэнка пра трагедыю палтаўскай пясняркі Марысі Чурай, дачкі ўкраінскага героя, якая „без суда асуджана”. Гэта гісторыя ў якой ахопліваеце і прабуеце раскрыць душу і сучаснай жанчыны.

— Маруся Чурай маўчыць перад судом ад гора, а сонцу распавядае пра сваю бяду. Сама сябе асуджае да вечнай пакуты.

— Чаму тэатр — „Зніч”?

— Зніч — непагасны агонь вайдэлотаў, крыніца жыцця. Ён асвятляе, абагравае, і спальвае зло.

— Як добра, што да нас сюды прыязджаюць урэшце беларусы, — сказала пані Галіна Багінская, адна з заўсёдных наведвальніц культурных мерапрыемстваў. Бо не толькі беларусы пацікавіліся спектаклямі мінскага тэатра. І панаракала, бо прыйшла толькі на апошні спектакль у Беластоку: — Мала было інфармацыі, рэкламы. Замала!

Галіну Дзягілеву запрасіў генконсул Міхал Аляксейчык

Віктар ШВЕД

Вечны агонь

Мужная Галіна Дзягілёва!
Яе настойлівасць, адчай
Услаўляюць беларускай мовай
Наш васільковы родны край.

Хай расцвітае ідэя святая
І разлягаецца ў эфіры кліч:
Няхай лунае, хай не патухае
І асвятляе цемень „Зніч”!

Беласток, 10.09.2008 г.

---

8 ☞працяг Беларусь эканамічным шляхам: праз аваладанне маёмасцю. Такую палітыку спадар Пазьняк называе тыбецкім варыянтам акупацыі.

Сітуацыя з прыняццем закону аб беларускім правапісе ды выкарыстанні адзінай яго версіі з магчымасцю прыцягнення да адміністрацыйнай адказнасці за памылкі пры пісьме на беларускай мове прывядзе да росту боязі ў людзей пісаць па-беларуску, што пагоршыць і без таго вельмі кепскае моўнае становішча ў краіне. І, што цікава, прыцягаць да крымінальнай адказнасці будуць тыя, хто сам не разумее беларускай мовы і ніколі на ёй не пісаў ды не размаўляў... А ўладарыць у гэты час будуць тыя, хто, магчыма, парасейску слова „хорошо” пісаць будзе з двума літарамі „а”...

У сваім выступе старшыня КХП-БНФ распавёў таксама пра сваё стаўленне да новай адукацыйнай рэформы, што ладзіцца зараз на Беларусі. „Рэформа, якая павінна рыхтавацца мінімум каля двух гадоў, праводзіцца адным указам! Якая мэта гэтага ўказа?” — пытаецца спадар Пазьняк і сам адказвае: „Мэта — адна: зніжэнне інтэлектуальнага ўзроўню нацыі”, — узгадваючы пры гэтым часы Сталіна, калі трэ было плаціць за навучанне ў старэйшых класах, а пераважная большасць насельніцтва абмяжоўвалася сямігодкай. Такая вось „лінія Сталіна” ад цяперашняй беларускай улады, якая такім чынам будзе бараніць беларусаў ад магчымасці атрымаць добрую адукацыю...

Цікавымі былі адказы на пытанні залы. На пытанне пра з’яўленне на грамадскай арэне трэцяга сына Лукашэнкі Зянон Пазьняк паведаміў пра новае адкрыццё беларускай ўлады: „Свет ведаў мацярок-адзіночак, зараз жа з’явіўся і першы бацька-адзіночка”.

На пытанне пра магчымасць аб’яднання краін Балтыі, Беларусі, Польшчы, Украіны, Чэхіі, Славаччыны ў адзіны Балта-Чарнаморскі звяз спачатку ўзяў слова Ілья Куніцкі. Ён паведаміў, што зусім нядаўна прэзідэнт Францыі паведаміў пра магчымасць стварэння такога звязу ў будучыні. Прычым, па словах кіраўніка французаў, жаданне браць удзел у такім звязе выказалі і прадстаўнікі Швецыі.

„Для Заходняй Еўропы стала відавочна, асабліва пасля падзей у Грузіі, што ў будычыні можа быць жыццёва неабходнаю дадатковая „мяжа” паміж сваімі тэрыторыямі ды землямі краіны, якая займае шостую частку свету. І такой „мяжою” можа выступіць Балта-Чарнаморскі звяз краін. Гэта вельмі небяспечная для Расіі і карысная для ўсіх астатніх краін Еўропы ідэя. Не дарэмна яна выклікала такое абурэнне ў расейскіх СМІ ў 90-х гадах! Пра такі звяз рэгулярна трэба нагадваць беларускім палітыкам у сваіх выступах ды праграмах і абмяркоўваць у беларускім незалежным друку ды іншых СМІ. Гэта вельмі моцная ідэя!” — падсумаваў адказ на пытанне Зянон Пазьняк.

Лагічнай высновай усіх выступаў прамоўцаў стала прыняцце канферэнцыяй рэзалюцыі. У ёй звяртаецца ўвага на неабходнасць змены палітыкі ўладамі дзяржавы ў дачыненні да беларускай мовы ды культуры, а таксама выказваецца пратэст супраць магчымага ўводу расейскай зброі ды расейскіх войскаў на тэрыторыю Беларусі.

Канферэнцыя скончылася адказамі на пытанні слухачоў з залы ды працягнулася нефармальнай дыскусіяй на ангельскай мове „Роля наступных пакаленняў беларускай дыяспары”, якая праводзілася пад кіраўніцтвам Паўліны Сурвілы.

Пасля на працягу больш чым пяці гадзін увага была пераведзена на беларускіх дзеячаў мастацтва. Наведвальнікі Сустрэчы мелі магчымасць больш дэталёва пазнаёміцца з працамі Алеся Шатэрніка ды яго дачкі Юліі, Віктара Коласа ды іншых беларускіх мастакоў. Са сваімі канцэртамі выступілі перад беларусамі свету Ала Орса-Рамана ды Віялета Кавалёва, гарманіст Федзя Паўлавец (дарэчы, адзіны беларускі лас-вегасавец на Сустрэчы), вядомы паэт і бард Сяржук Сокалаў-Воюш ды іншыя. Былі паказаны стужкі з запісамі выступаў вядомага беларускага песняра Данчыка ды фільмы „Беларускі супраціў” Антося Цялежнікава і „Дзень Волі” Юрыя Хашчавацкага ды Уладзіміра Арлова.

Перад беларусамі замежжа стаіць зараз шмат пытанняў, якія трэба вырашаць як мага хутчэй, бо сёння Беларусь знаходзіца ў вельмі небяспечным становішчы. І, магчыма, менавіта зараз (улічваючы і тэхналагічны прагрэс, і рост дабрабыту беларусаў замежжа) дыяспара мае найлепшыя магчымасці дапамагаць сваім сябрам — змагарам за вольную Беларусь, што знаходзяцца на Радзіме — і разам з імі рабіць нашу агульную беларускую справу. З мэтай усталявання кантактаў паміж усімі тымі, у каго Беларусь жыве ў сэрцы, і праводзяцца такія сустрэчы, вынікі якіх будуць адчувацца яшчэ, спадзяемся, не адзін год.

Вялікае Княства Паэтаў (ВКП) у Беластоку

Тэкст і фота Ганны КАНДРАЦЮК

— Калі я быў дзіцяткам, я ўжо ведаў, што самай важнай задачай літаратуры ёсць грунтаванне сяброўства паміж паэтамі, — пачаў Яцак Падсядла.

У доказ сказанага, туз польскай сучаснай паэзіі (як заўсёды ў цішэрце з выявай літаратурнай шэльмачкі „Піпі Лангштрум" і дрэдамі на мудрай галаве), падмаргнуў Міхалу Анемпадыставу. І каб не кідаць слоў упустую, ён дастаў з кішэні скамечаны ліст паперы і прачытаў свой верш прысвечаны Міхалу, інспіраваны ягонай „Маткай Боскай Астрабрамскай" з музычнага праекта „Народны Альбом".

Міра Лукша і Геркус Кунчыюс

Яшчэ да выступлення Яцка Падсядлы, у кавярні „Фама" татальна павеяла ўсходнім містыцызмам і палымянай эротыкай. Такую моц нясе ў сабе паэтычнае слова Тадэя Карабовіча, украінскага паэта з Голі на Холмшчыне. Для мяне гэта быў адзін з самых нечаканых момантаў у Ноч Паэтаў, якая здарылася з 5 на 6 верасня г.г. у Беластоку...

— Я пачытаю вам свой верш інспіраваны фатальным цунамі пры канцы 2004 года, — прапанаваў паэт з Голі *(Мы прапануем яго чытачам „Нівы" ў аўтарскім перакладзе ніжэй падпісанай):*

ціхнуць буры, вятругі, тарнада, узбураны акіян
выгладжваецца на вадзе і зноў вяртаецца каханне мужчыны і жанчыны
іх аголеныя целы падглядае анёл са стрыманым
шэптам на вуснах
з ціхім крыллем
іконы глядзяць святлістымі нутрамі сваіх душ
Бог аддаляе канец часу
нехта запальвае свечкі ў часоўні
на вялікім бязлюддзі
і малітва калыша савянят
у прыдарожным крыжы

— Паэты гэта фантастычныя, здольныя на кожны чын людзі, — пераконваў публіку (у большасці маладую) Войцех Каранкевіч, паэт, зорка беластоцкага тэлебачання і заадно мадэратар сустрэчы.

— Для паэта пакласці голаў у вогнішча ці з'есці муху, — цягнуў Каранкевіч, — гэта прышч, нішто!

Менавіта, такую амбітную мэту, як прамоцыя феномена паэта, паставілі сабе арганізатары — Беластоцкі асяродак культуры. Мерапрыемства адбывалася ў рамках Фестывалю „Іншае вымярэнне".

— Слова перастала дзейнічаць на чалавека, — заявіў Геркус Кунчыюс з Вільні, — зараз літоўская літаратура нікому непатрэбная, яна мае маргінальнае значанне. Такія часы.

Горкім словам паэта, дарэчы, вельмі адпаведным і беларускай літаратуры, пярэчыла шматлюдная публіка, якая ў засяроджанасці і цішы прасядзела да поўначы (горш было з купляй кніжак!).

— Для мяне было важна данесці беластоцкай публіцы слова ў роднай мове, — сказала Міра Лукша.

Наша рэдакцыйная сяброўка, з каронай на галаве запрэзентавалася як сапраўдная княгіня беларускай літаратуры. Галоўны акцэнт яе прэзентацыі быў пакладзены на ідэю сяброўства паміж народамі. Кантэкст гэтага сяброўства Міра Лукша знаходзіць у Вялікім Княстве Літоўскім, таму сустрэча невыпадкова адбывалася пад лозунгам: „Вялікае Княства Паэтаў"! За сталом сустрэліся прадстаўнікі літоўцаў (Геркус Кунчыюс), беларусаў (Міра Лукша, Міхал Анемпадыстаў), палякаў (Яцэк Падсядла, Каміль Сіповіч), украінцаў (Тадэй Карабовіч).

Сама ідэя як і падборка князёў-літаратараў не здзівіла старых фанатаў літаратуры. Грунтаванню сяброўства паміж паэтамі, народамі, поламі, музычнымі трэндамі (тут асабліва падмацаваўся грунт польска-беларускі) цягам папярэдніх 15 гадоў выдатна паспрыялі акцыі літаратурна-мастацкага аб'яднання „Карткі". Многія польскія літаратары, як згаданы ў пачатку туз польскай паэзіі Падсядла, самі прызнаваліся да беларускіх каранёў (першая прэзентацыя яго зборніка „Цісоўка" адбылася ў роднай вёсцы рэдактара „Картак" — Цісоўцы ў Міхалоўскай гміне). Зараз таксама, ужо ў час неафіцыйнай часткі, Каміль Сіповіч, польскі паэт, філосаф і музычны менеджэр (у прыватнасці братанак беларускага біскупа Чэслава Сіповіча), выказаў небанальны тост:

— Давайце вып'ем за сустрэчу беларусаў з беларусамі!

На жаль, ідэю сяброўства паміж паэтамі праігнаравалі беластоцкія паэты старэйшага пакалення. Калі я спыталася ў аднаго з іх пра адсутнасць у Ноч Паэтаў, ён са шчырасцю дзіцяткі адпаліў:

— Мяне ж ніхто туды не прасіў!

Пачатак восені — пачатак навучальнага года. Школьнікі сядаюць за парты, студэнты зноўку абжываюць універсітэцкія аўдыторыі, а настаўнікі і выкладчыкі прымаюцца за перадачу ім усім сваіх ведаў. Сёлетнія адукацыйныя перыпетыі ў Беларусі, калі лукашэнкаўскія ўлады скарачаюць колькасць навучальных гадзін па разнастайных прадметах, ды і ўвогуле змяншаюць тэрмін набыцця сярэдняй адукацыі, нічога, акрамя смутку, выклікаць не могуць. Лукашэнкаўскаму рэжыму не патрэбны аніякі Балонскі працэс, а колькасць людзей у Беларусі, маючых вышэйшую адукацыю, на думку прыслужнікаў такой улады, надта вялікая. З таго — няма чаго рыхтаваць школьнікаў да паступлення ў ВНУ, тлумачаць свае антыадукацыйныя памкненні лукашэнкаўскія клеркі ад адукацыі, бо не хапае працоўных рук.

Зразумела, з такім падыходам Беларусь усё больш аказваецца на ўзбочыны сусветнага адукацыйнага працэсу. Праўда, не ўся, бо дзеючы сёння ў Літве Еўрапейскі гуманітарны ўніверсітэт — гэта найбольш яскравая альтэрнатыва наступіўшай у Беларусі дэградацыі навучання.

Многія ведаюць гісторыю гэтага вальнадумнага ўніверсітэта. Узгадаю, што ў 2004-2005 гадах ён пераўтвараецца ва ўніверсітэт на выгнанні. Але якасць адукацыі наўрад ці стала горшай. Зразумела, каб сцвярджаць гэта катэгарычна, варта пазнаёміцца з ЕГУ. І гэта мы можам, набраўшы на сваім камп'ютары адрас у інтэрнэце http://bel.ehu.lt.

Універсітэцкі сайт зроблены традыцыйна — падзелены на тры часткі, дзе першая злева — выйсці да рубрык; другая, сярэдняя — змест той ці іншай старонкі; а трэцяя — невялікія навінныя паведамленні і аб'явы.

Галоўная старонка прысвечана больш падрабязнаму расповеду пра гісторыю ЕГУ, поглядам кіраўніцтва гэтай ВНУ на сённяшнюю палітыку Беларусі, меркаванні студэнтаў аб навучанні ва ўніверсітэце. „Тое, што ЕГУ патрапіў у няміласць, стаў раздражняльнікам для беларускай улады, шмат пра што кажа. Напрыклад, пра ўзровень прапанаванай адукацыі, як магутнага канкурэнта і альтэрнатыву дзяржаўным ВНУ Беларусі. Акрамя таго, ён — крыніца фармавання еўрапейскага мыслення, распаўсюду ідэй дэмакратыі і лібералізму". „ЕГУ ўяўляе цікавасць як незалежная навучальная ўстанова, якая абараніла свой пункт гледжання, не саступіўшы сваіх незалежных пазіцый перад ціскам улад; вабіць таксама еўрапейскі падыход да вучэбнага працэсу. Універсітэт з'яўляецца адным з цэнтраў беларускага нацыянальнага адраджэння, рыхтуе маладых беларускіх інтэлектуалаў, здольных сфармаваць новую нацыянальную эліту", — даюцца прыкладна такія вось невялікія расповеды студэнтаў пра ЕГУ. Праўда, выклікае здзіўленне, чаму гэтыя расповеды гучаць ад ананімаў.

Быць па сутнасці беларускім універсітэтам, які дзейнічае за мяжой, даволі складана з фінансавага пункту гледжання. Няма аніякай падтрымкі з боку дзяржавы. Але ЕГУ не толькі існуе — ён прадастаўляе студэнтам з Беларусі бясплатнае навучанне. Больш за тое — ён нават выплачвае ім стыпендыі. Такія фінансавыя магчымасці былі б немажлівыя без падтрымкі ВНУ іншымі краінамі і, зразумела, грантадаўцамі, якія бачаць слушным для сябе спрыяць годнаму ўзроўню адукацыі для беларусаў з Беларусі насуперак антыадукацыйнай палітыцы лукашэнкаўскіх улад.

Уладзімір ЛАПЦЭВІЧ

„Псіхалагічная" вікторыя

Перамога футбольнай зборнай Беларусі над Андорай стала надзвычай важнай у гісторыі нашай зборнай. Мажліва пры гэтых словах шаноўны чытач іранічна ўсміхнецца, але рацыі мець не будзе. Безумоўна, у летапісе беларускай дружыны былі вікторыі і больш эфектныя і над куды мацнейшымі супернікамі, але ацэньваць мінулы паядынак трэба найперш зыходзячы з кантэксту сітуацыі і з гледзішча псіхалогіі каманды. Пасля прыкрай і ў многім несправядлівай паразы ад Украіны для беларусаў было важна вярнуць веру ў сябе. Для гэтага патрабавалася толькі перамога над зборнай маленькай краіны, якая даўно ў стане „папсаваць кроў" каму заўгодна. Так у папярэднім туры адчайны супраціў андорцаў ледзь зламала Англія. Таму лёгкага жыцця чакаць не даводзілася. Першы тайм гэта толькі пацвердзіў. Адзін раз у ім прыхільнікі каманды Бернда Штанге ўсё ж парадаваліся. У той час, калі андорцы ўсёй камандай пільнавалі беларускую групу атакі на авансцэну нечакана выйшлі нашы абаронцы — Ягор Філіпенка скінуў галавой мяч Дзмітрыю Верхаўцову, які не мог не скарыстацца цудоўным момантам. Гэта быў першы гол за нацыянальную дружыну маладога цэнтральнага абаронцы, якога можна лічыць сапраўдным адкрыццём сезону — да нядаўняга часу гульца наваполацкага „Нафтану" мала хто ведаў нават у Беларусі.

Пачатак другога тайму быў лепшым адрэзкам у выкананні беларусаў. Ён мог завяршыцца і другім голам, але пасля таго, як эфектна стрэліў Аляксандр Кульчы (ветэран вылучаўся ў гэты дзень у нашым складзе), мяч трапіў у крыжавіну брамы. А далей здарыўся сапраўдны канфуз. У адным з рэдкіх выпадаў андорцаў пасля лёгкага кантакту форварда гаспадароў з Верхаўцовым валійскі рэферы нечакана прызначыў пенальці. 1:1 за дваццаць з хвосцікам хвілін да фінальнага свістка і абгрунтаваная трывога страты так чаканых пунктаў навісла нібы горы над андорскім стадыёнам. Але ў калодзе Штанге знайшоўся сапраўдны джокер — Віталь Радыёнаў, дзеянні якога сталі выратавальнымі. На пару з Вячаславам Глебам яны арганізавалі два так патрэбныя галы. Спярша вызначыўся форвард БАТЭ — умела вырваўся на аператыўны прастор і зграбна пакаціў мячык, які ад штангі трапіў па прызначэнні. А на 90-й хвіліне ўжо Радыёнаў пасаваў Глебу-малодшаму, які расстрэльваў па-сутнасці пустую браму. Адзначым, што ў абодвух камбінацыях браў удзел і Аляксандр Глеб, які спакваля ўсё ж становіцца лідарам сярод беларускіх футбалістаў не толькі па велічыні кантрактаў. Перамога з лікам 3:1 безумоўна надала аптымізму перад сустрэчай 15 кастрычніка ў Мінску з Англіяй. Брытанцы ўзялі рэванш у заклятых супернікаў, харватаў — 4:1 і разам з Украінай, што адолела ў гасцях 3:1 Казахстан, выйшлі ў лідары групы. Але асноўнае змаганне наперадзе.

Тым часам моладзевая зборная Беларусі ў ліку 14 іншых дружын выйшла ў плэй-оф чэмпіянату Еўропы. Трапіць туды было не так проста. Прыкладам, усе нашы суседзі, у тым ліку, расіяне, палякі і ўкраінцы гэтага не здолелі. Супернікам беларусаў паводле лёсавання ў накаўт-раўндзе будзе дружына Турцыі. Іншыя пары склалі Нямеччына-Францыя, Данія-Сербія, Аўстрыя-Фінляндыя, Уэльс-Англія, Італія-Ізраіль, Швейцарыя-Іспанія. Матчы адбудуцца 11-12 і 14-15 кастрычніка. Першы матч беларусы згуляюць у гасцях.

Уладзімір ХІЛЬМАНОВІЧ

Чалавек — каваль свайго лёсу...

Як кожная рэч, так і жывая істота, маюць сваё найменне. У энцыклапедыі, напрыклад, у артыкуле „Чалавек” запісана: „Чалавек, вышэйшая ступень эвалюцыі жывых арганізмаў на Зямлі, прадстаўнік біялагічнага віду, сацыяльная істота і суб’ект гісторыі. (...) Чалавек адрозніваецца ад іх [жывых арганізмаў — аўт.] наяўнасцю свядомасці, абстрактнага мыслення і мовы, здольнасцю пранікаць у сутнасць навакольных прадметаў і самога сябе” (Беларуская энцыклапедыя, Мінск 2003, т. 17, с. 210). А Васіль Сакоўскі ў сваю чаргу піша наступнае: „Чалавек — гэта такая самалюбная істота, якой, здаецца, немагчыма задаволіць, давесці да канчатковага задавальнення сабой. Яму заўсёды чагосьці яшчэ не хапае” („А гады плывуць і плывуць...”, „Ніва” № 34 ад 24 жніўня 2008 г.). Аналізуючы пытанне чалавечай істоты, не цяжка прыйсці да высновы, што тэорыя разыходзіцца з практыкай. Па-мойму, разумны чалавек (паводле энцыклапедыі, здольны пранікаць у самога сябе) не можа быць эгаістычным снобам. Разумны чалавек разважліва паводзіць сябе, не прысвойвае дрэнных звычак, разумее талерантнасць ды з пашанай ставіцца да іншых. Як затым патлумачыць тэзіс спадара Сакоўскага? Дзе дашуквацца прычыны паталагічных з’яў?

Глянем на сучасную рэчаіснасць і не так ужо адлеглае мінулае. Гэта праўда, што раней умовы існавання вясковай грамадскасці намнога сціплейшымі былі чым зараз. Але іншай праўдай з’яўляецца і тое, што міжлюдскія суадносіны інакш ладзіліся. Моладзь да жыцця ставілася інакш, нечым карысным займалася, ладзіла культурныя мерапрыемствы, у грамадскіх працах удзельнічала. Народ па-хрысціянску жыў, так як закон Божы патрабуе. Зараз усё адмянілася. Моладзь, карыстаючыся „свабодай”, не звыкла слухаць бацькоў і спускаецца на бездараж. Гарэлка, наркотыкі, насілле і злачынствы — гэта штодзённая нашай рэчаіснасці. І самае сумнае, што ў гэтым удзельнічае ўсё больш малалеткаў. Адкуль бяруцца дрэнныя звычкі ў нашай моладзі? Няўжо ў школе гэтаму навучаюць? Народная мудрасць гаворыць: „Яблык ад яблыні далёка не адкоціцца”. І гэта праўда. Статыстыка паказвае, што большасць малалетніх злачынцаў выводзіцца з паталагічных сем’яў, хоць і ў гэтых „паважаных” трапляюцца адродкі. На маю думку, бацькі нясуць у большай меры адказнасць за выхаванне дзетак. Гэта ж мы малечаў прывучаем да задавальнення ўсіх іхніх пажаданняў. У прысутнасці дзетак усчынаем сямейныя спрэчкі, запрашаем да супольных пачастункаў пры гарэлцы, неаднойчы прапануючы чарку віна ці спіртнога. А колькі ж разоў падростку піва прыносім дахаты? Ды вось, даражэнькія, з піва ўсё пачынаецца. Цяжка пазней адвыкаць ад таго, чаму з маладосці прывучыўся.

Такія выпрабаванні некалькі разоў і я ў жыцці праходзіў. Тычыцца гэта дрэннай звычкі курэння, як і спажывання алкагольных напіткаў. Усё было добра, калі чалавек здароўем карыстаўся. Жыў тады без праблем, прыпяваючы. Кампанія, сяброўскія сустрэчы... Але, як вядома, жыццё любіць сюрпрызы падкідаць. Так было ў маім выпадку. Застаўся сам у чатырох сценах. Жонка памерла. Сябры не наведваюць. Дзеці сваімі праблемамі займаюцца, а мне прыходзіцца аднаму са сваімі клопатамі спраўляцца. Але не пападаю ў дэпрэсію. Агародчыкам у летні час займаюся, бо надта моцна люблю гэта рабіць, і ў „Ніву” пішу. Гэта дае мне задавальненне. І тут пакарыстаюся цытатай з артыкула Васіля Сакоўскага: „...кожны этап людскога кругавароту нясе ў сабе як мілыя, так і цяжкія сюрпрызы. Можна прайсці іх паспяхова, пераможна, але дзеля гэтага патрэбны тут немалы ўдзел, высілак і з нашага боку. Без поўнай самааддачы не будзе добрых вынікаў”. Лічу, што і гэтым разам спраўлюся са сваімі праблемамі. А ў сваю чаргу пакарыстаюся народнай мудрасцю: „Кожны чалавек — каваль свайго лёсу”. Варта аб тым памятаць.

Уладзімір СІДАРУК

Помнік Я. Купалу і Я. Коласу ў Варшаве

Па ініцыятыве Пасольства РБ праведзена сустрэча пасла Беларусі ў Польшчы Паўла Латушкі са старшынёй гарадскога савета Варшавы Даротай Маліноўскай-Групінскай па пытаннях пабудовы ў Варшаве помніка Я. Купалу і Я. Коласу.

Падчас сустрэчы пасол падрабязна паінфармаваў польскі бок аб прапрацоўцы на працягу 2003-2008 гг. пытанняў пабудовы ў Варшаве помніка беларускім класікам Янку Купалу і Якубу Коласу і выказаў меркаванне, што Гарадскі савет Варшавы мог бы аказаць станоўчую падтрымку ў гэтай справе. Са свайго боку Д. Маліноўская-Групінская выказала зацікаўленасць гэтым праектам і паабяцала яго абмеркаванне на бліжэйшым пасяджэнні камісіі па справах культуры ў другой палове верасня б.г. Д. Маліноўская-Групінская таксама паінфармавала, што ініцыятыва ўстаноўкі помніка Я. Купалу і Я. Коласу падтрымоўваецца з боку ўрада Польшчы.

Раней Грамадскім камітэтам пабудовы помніка Я. Купалу і Я. Коласу быў накіраваны ліст да прэзідэнта Варшавы аб падтрымцы ідэі і магчымым месцы пабудовы помніка. У лісце ў адказ з боку прэзідэнта Варшавы „вітаецца з зацікаўленасцю цэнная ініцыятыва” стварэння помніка класікам беларускай літаратуры Янку Купалу і Якубу Коласу ў Варшаве, адначасова было выказана меркаванне аб неабходнасці пошуку новага месца для яго ўстаноўкі са спасылкай на тое, што прапанаваныя месцы ўжо насычаны помнікамі і ахоўваюцца сталічным кансерватарам помнікаў.

Грамадскі камітэт пабудовы помніка Я. Купалу і Я. Коласу быў створаны ў 2004 годзе, у яго склад уваходзяць каля 30 вядомых польскіх дзеячаў, прадстаўнікоў улад, пасол Беларусі ў Польшчы. Ідэя пабудовы помніка Я. Купалу і Я. Коласу ў Варшаве з’явілася адначасова з адкрыццём у Мінску помніка Адаму Міцкевічу (ужо чацвёртага на Беларусі).

Ініцыятыва паўстання помніка класікам беларускай літаратуры была падтрымана ў 2004 годзе і тагачасным прэзідэнтам Варшавы Лехам Качынскім, а таксама Міністэрствам культуры Польшчы, рэктарам Варшаўскага ўніверсітэта.

Пасольства плануе і надалей падтрымліваць дзейнасць Грамадскага камітэта па ажыццяўленню неабходнай працы па рэалізацыі ідэі пабудовы помніка класікам беларускай літаратуры ў Варшаве.

Прэс-служба Пасольства РБ

Міхалоўская гміна

Царква — візітнай картачкай

Міхалоўская царква — каштоўны помнік старадаўнасці. Яна ў гэтым годзе будзе святкаваць сотую гадавіну існавання. Зараз яе рамантуюць. Усе купалы накрываюць пазалочанай бляхай, малююць сцены. Рамонт будзе каштаваць каля 100 тысяч злотых.

Старая драўляная царква з’яўляецца турыстычным атракцыёнам Міхалова. У ёй знаходзяцца арыгінальныя іконы, напісаныя Адамам Сталёны-Дабжанскім. Падобныя роспісы гэтага ж мастака былі і ў Праабражэнскай царкве на Грабарцы, але згарэлі разам з царквой падчас пажару.

Юбілейныя ўрачыстасці запланаваны на кастрычнік гэтага года.

Занядбаная пачакальня

Шмат маляўнічых куткоў у Міхалоўскай гміне, м.інш. у наваколлі Юшкавага Груда, Круглага Ляска і Сушчы. Дарогі тут гладкія, асфальтавыя, палі не зараслі лесам. А якія лугі ў даліне рачулкі Руднік! Усе пакошаныя, бясконцыя.

Пры ўсім гэтым звярнуў я ўвагу на запушчаную, з пакрэмзанымі шпрэем надпісамі і бруднымі сценкамі мініпачакальню на аўтобусным прыпынку ПКС Таніца на абочыне ваяводскай дарогі Юшкаў Груд — Бандары — Новае Ляўкова — Нараўка. Лавачкі з яе выкінулі і пад дашак паклалі слуп, на якім раней вісеў расклад язды аўтобусаў. Пад дашкам балота і поўна сасновых шышак ды ігліцы (тут растуць дзве сасны).

Пачакальню неабходна добраўпарадкаваць, памаляваць сценкі, павесіць расклад. Спатрэбіліся б лавачкі. Будзе гэта пэўна адзіны такі дашак у Міхалоўскай гміне. Але, як кажуць, лыжка дзёгцю псуе бочку мёду.

(яц)

Адгаданка

1	2	3	4	5	6	7	8	9	10	11	12
13	14	15	16	17	18	19	20	21	22	23	
		24	25	26	27	28	29	30	31	32	

Шыфраграма

Літары адгаданых слоў, перанесеныя згодна з іх парадкавымі нумарамі ў клеткі роспісу, складуць рашэнне — дацкую прыказку.

1. крумкач крумкачу яго не выдзеўбе = 8 _ 29 _ 23 _ 7 _ ;

2. асобныя кварталы горада, выдзеленыя для пражывання дыскрымініраваных груп насельніцтва = 6 _ 32 _ 2 _ 3 _;

3. прыстасаванне для сядзення некалькіх чалавек у выглядзе дошкі на ножках = 15 _ 9 _ 10 _11 _ 12 _;

4. кавалак распілаванага і рассечанага бервяна на паліва = 26 _ 31 _ 28 _ 25 _ 24 _ 27 _;

5. сталіца Латвіі = 21 _ 22 _ 13 _ 14 _;

6. тое, што сніцца таму, хто спіць = 17 _ 16 _ 18 _;

7. глухі гук, які нагадвае працяглае вымаўленне гука „с” = 1 _ 19 _ 20 _;

8. напрыклад бельскія „Васілёчкі” = 30 _ 5 _ 4 _.

(ш)

Сярод чытачоў, якія на працягу месяца дашлюць у рэдакцыю правільныя адказы, будуць разыграны кніжныя ўзнагароды.

Адказ на адгаданку з 33 нумара

Скарына, Данія, зорка, сокал, амін, рэвень, Чылі, Пацей, ідал, юрыст, цырк, кашуля, цынік, алень.

Рашэнне: **Ад злосці малыя рэчы пакідаюць вялікі цень.**

Кніжныя ўзнагароды высылаем **Галене Тапалянскай** з Трасцянкі і **Мікалаю Сазановічу** з Навін-Вялікіх.

Ніва
ТЫДНЁВІК БЕЛАРУСАЎ У ПОЛЬШЧЫ
PL ISSN 0546-1960
NR INDEKSU 366714

Выдавец: Праграмная рада тыднёвіка „Ніва”.
Старшыня: Яўген Вапа.
Адрас рэдакцыі: 15-959 Białystok 2, ul. Zamenhofa 27, skr. poczt. 84.
Тэл./факс: (+48 85) 743 50 22.
Internet: *http://niva.iig.pl/*
E-mail: *redakcja@niva.iig.pl*
Zrealizowano przy udziale wsparcia finansowego Ministra Spraw Wewnętrznych i Administracji.

Галоўны рэдактар: Яўген Вапа.
Намеснік гал. рэдактара: Віталь Луба.
Тэхнічны рэдактар: Адам Паўлоўскі.
Рэдактар „Зоркі”: Ганна Кандрацюк-Свярубская.
Публіцысты: Міхась Андрасюк, Мікола Ваўранюк, Аляксандр Вярбіцкі, Ганна Кандрацюк-Свярубская, Ілона Карпюк, Міраслава Лукша, Аляксей Мароз, Мацей Халадоўскі, Віктар Сазонаў, Уладзімір Хільмановіч.
Канцылярыя: Галіна Рамашка.
Друкарня: „Orthdruk”, Białystok.
Текстаў не замоўленых рэдакцыя не зварацае. Zastrzega sobie również prawo skracania i opracowania redakcyjnego tekstów nie zamówionych. Za treść ogłoszeń redakcja nie ponosi odpowiedzialności.
Prenumerata: I kwartał 26 zł. do 5 grudnia 2008 r. Wpłaty przyjmują urzędy pocztowe na terenie woj. podlaskiego oraz oddziały „Ruch” i „Kolporter” na terenie całego kraju.
Prenumerata z wysyłką za granicę **pocztą zwykłą** wynosi: kwartalna — 131 zł.; półroczna — 224 zł.; roczna — 374 zł. **Pocztą lotniczą**: Europa — prenumerata kwartalna — 142 zł., półroczna — 243 zł., roczna — 405 zł. Ameryka Północna, Południowa, Środkowa, Afryka, Azja — prenumerata kwartalna — 160 zł., półroczna — 274 zł., roczna — 456 zł. Australia i Oceania — prenumerata kwartalna — 204 zł., półroczna — 350 zł., roczna — 583 zł.
Wpłaty do 5 dnia miesiąca poprzedzającego prenumeratę przyjmuje „RUCH” S.A., Oddział Krajowej Dystrybucji Prasy, ul. Jana Kazimierza 31/33, 01-248 Warszawa, Pekao S.A. IV O/ Warszawa,
Nr 68 1240 1053 1111 0000 0443 0494.
Prenumeratę można zamówić w redakcji. Planowana ilość numerów „Niwy” w 2008 roku — 52.
Poczta zwykła: Cena 1 egz. wraz z wysyłką w kraju wynosi 3,65 zł. Cena 1 egz. wraz z wysyłką za granicę — kraje europejskie — 5,00 zł. — kraje pozaeuropejskie — 5,20 zł.
Poczta lotnicza: Cena 1 egz. wraz z wysyłką za granicę: — kraje europejskie — 6,00 zł, — Ameryka Północna, Afryka — 6,70 zł., — Ameryka Południowa — 7,80 zł., — Australia i Oceania — 10,00 zł.
Wpłaty przyjmuje:
Rada Programowa Tygodnika „Niwa”,
BANK PEKAO S.A. O/Białystok
38 1240 5211 1111 0000 4929 0945

Накład: 1 000 egz.

Маліліся за беластоцкіх школьнікаў і беларускі народ

Фотарэпартаж Ганны КАНДРАЦЮК

Ці можна радавацца духоўнасцю веры і словам на роднай мове, спалучаных разам, тут у нас на Беласточчыне? Аказваецца, можна аж да слёз і супольнай узрушанасці дзяцей і дарослых. У пятніцу, 12 верасня з ініцыятывы Аб'яднання бацькоў АБ-БА у царкве св. Юрыя айцом Рыгорам Місіюком быў адслужаны малебен за дзяцей і моладзь, якія вывучаюць беларускую мову ў садку і школах горада Беластока. Перажыванне за будучае нашых дзетак было і тым выклікам для бацькоў каб зрабіць традыцыйным штогадовы малебен на роднай мове. Па колькасці прысутных сем'яў на малебне ў гэтым годзе, трэба выразна сказаць, што запатрабаванне на беларускую мову ў царкве ёсць не толькі раз у год, але

беларускія багаслужбы павінны быць штотыднёвай неад'емнай часткай багаслужбаў ва ўсіх цэрквах Падляшша — на хвалу Богу і радасць нам грэшным. Айцец Рыгор дзеля гэтага мадыфікаваў словы малебна, дзякуючы якім адчувалі мы ўсе пачуццё супольнасці абранага намі шляху і адказнасці за духоўнае выхаванне блізкіх і зберагання беларускасці. А мо ва ўсіх школах і на ўроках рэлігіі варта пагутарыць з Усявышнім на таксама спрадвечнай беларускай мове? І калі ўсе прысутныя цалавалі крыж і дзяліліся просфірай у царкве паплылі словы рэлігійнага беларускага гімна „Магутны Божа". Рассыпаліся праменні Божай красы ў анямелых часта беларускіх сэрцах і душах. **(яв)**

21.09 — 27.09

(22.03. — 20.04.) Да 23.09. непаразуменні і канфлікты ды сваркі, якія вырастуць з малога непаразумення. Будзеш гаваркі, кантактоўны, адных будзеш ашчасліўліваць кампліментамі, другіх жорстка аблаеш. Але твая лагоднасць прынясе спрыянне іншых.

(21.04. — 21.05.) 21-25.09. — радасць жыцця, фінансавыя поспехі. Добрыя пакупкі. Знакаміта ў прафесійных справах не толькі для цябе, але і тваіх знаёмых; будзеш добрым дарадчыкам. Падвучыся, назбірай матэрыялаў — яны неўзабаве спатрэбяцца.

(22.05. — 22.06.) 21-25.09. малым накладам сіл здабудзеш відны поспех. Дакажаш усім, што можаш! З 24.09. некаторыя твае намеры могуць ускладніцца, у некаторых будзеш бездапаможны, у іншых будзеш дзейнічаць усляпую. Дай сабе больш часу на абдуманне рашэнняў.

(22.06. — 23.07.) Варта заініцыяваць новае мерапрыемства. Звер думкі і дзеянні — некаторыя справы цягні далей, іншыя — пакінь. Глядзі наперад, у будучыню — яна ў святлейшых колерах!

(24.07. — 23.08.) Да 23.09. не будзь прычэплівы, пагадзіся з гэтым, што ты не заўжды пан сітуацыі. Калі будучыня ў тваёй пары залежыць ад партнёра, не рабі на яго націскаў. Знакаміты настрой, атачэнне мілых людзей, асабліва ў апошняй дэкадзе верасня.

(24.08. — 23.09) 21-25.09. моцны рост энергіі, сіла, каб перанесці магчымыя паразы, няблага ў інтарэсах. Да 22.09. і з 26.09. агромная інтуіцыя, дзякуючы якой разбярэшся ў кожнай сітуацыі. З 24.09. некаторыя твае справы могуць ускладніцца. Некаторыя справы кінеш, бо здадуцца табе малаважнымі.

(24.09. — 23.10.) 21-25.09. удасца табе дасягнуць усяго, на чым табе найбольш залежыць і што для цябе найважейшае, ды лепш гэта рабі адзін, бо не ўсе цябе зразумеюць. Шмат нагод для рамантычных сустрэч. Бярыся таксама рэалізаваць свае найважнейшыя прафесійныя справы.

(24.10. — 22.11.) 21-25.09. шмат гармоніі і спакою. Не выведуць цябе з раўнавагі справы, ад якіх у іншы час ты закіпеў бы. Знакаміта пойдзе ў фінансах, а ў пачуццях шмат што высветліцца. Да 23.09. не злоўжывай сваёй перавагай над іншымі.

(23.11. — 22.12.) Схочацца прызнацца ў пачуццях старому сябру ці каляжанцы, але ці варта псаваць сяброўства? (асабліва ў Стральцоў з 7-14.12.!). Калі выбіраешся ў новую школу, сустрэнуць цябе цудоўныя людзі. Горш, аднак, у адносінах дома. І не павучай шэфа!

(23.12. — 20.01.) Сустрэнеш многа спрыяючых табе людзей, якіх парадамі варта пакарыстацца. Хоць можаш трапіць і на такіх, што зваляць на цябе ўсю чорную работу! Пасля 24.09. не праводзь ніякіх размоў наконт прафесійных спраў — або высновы будуць нятрапныя, або хтось цябе кепска зразумее.

(21.01. — 19.02.) Знакамітыя вынікі на працы і кампанейскія поспехі. Варта якраз цяпер выбрацца ў падарожжа за мяжу. Паслабець могуць адносіны з партнёрам, асабліва калі разам працуеце; пазбягайце спрэчак!

(20.02. — 21.03.) З 26.09. выявяцца ў табе новыя таленты. Добра ў інтарэсах. 20-24.09. з поспехам супрацьставішся несправядлівасці. Фундані сабе файнае падарожжа, нават далёкае! А што! Некаторых тваіх сяброў агорне манія вялікасці — а ну іх!

Агата АРЛЯНСКАЯ

ISSN 0546-1960

Ніва
ПРА КНЯЗЯ АСТРОЖСКАГА

Князь Канстанцін Астрожскі, асветны і дзяржаўны дзеяч

Тэкст і фота
Аляксандра ВЯРБІЦКАГА

11 жніўня 2008 года ў Цэнтры праваслаўнай культуры ў Беластоку адбылася міжнародная навуковая канферэнцыя на тэму: „Князь Канстанцін Васіль Астрожскі, асветнік і абаронца праваслаўя", ладжаная Беластоцка-Гданьскай епархіяй, Фондам імя князя Канстанціна Астрожскага ды Супрасльскай акадэміяй. У яе ходзе былі зачытаны пяць дакладаў і адна абшырная інфармацыя. Паколькі на гэтых старонках немагчыма прывесці літаральнага зместу ўсяго там зачытанага — а прадстаўленыя там інфармацыі павінны зацікавіць сучаснага чытача — я абмяжуюся тут суб'ектыўным рэзюміраваннем іх зместу.

Першы даклад зачытаў вроцлаўска-шчэцінскі **архіепіскап Іерэмія**:

Справа адзінства Касцёла між Фларэнтыйскай і Брэсцкай уніямі

Князь Астрожскі меў дачыненне з тым, што вырасла раней — у час Ферара-Фларэнтыйскага сабора 1438-1439 гадоў, яго прысак тлеў з таго часу засакрэчана і больш адкрыта. Я мушу прызнацца, што ў мяне часта з'яўлялася пачуццё агіды, калі я рыхтаваў гэты даклад. Таму што трэба было сутыкнуцца з непрыемнымі здарэннямі, з людзьмі, іх справамі і паводзінамі, якіх зусім не павінна быць у гісторыі чалавецтва.

Спачатку я хачу прысвяціць некалькі слоў падгатоўцы Фларэнтыйскай уніі. Мой тэзіс такі, што гэтая падзея вырасла не з пошукаў багаслоўскага адзінства, але з палітычных інтарэсаў раз'яднанай Еўропы ды апынуўшайся ў стане палітычнага ўпадку Візантыі, спробай яе ратунку. Канцэпцыя ратавання Візантыі здавалася нават мець перспектывы поспеху ў выніку разгромнай паразы асманскага султана Баязіда ад татараў Тамерлана ў 1402 годзе. Але гэта была толькі кароткая слабасць асманскай дзяржавы. У той час, у выніку асманскага націску і крыжовых паходаў, візантыйская дзяржава была згорнута адно да Канстанцінопаля, некалькіх анклаваў у Грэцыі і некалькіх астравоў. Паводле некаторых гісторыкаў, у 1438 годзе Канстанцінопаль налічваў каля дваццаці тысяч жыхароў. На тэрыторыі грэчаскіх астравоў існавала складаная для вызначэння колькасць дзяржаўных адзінак. Гэты лік пастаянна мяняўся, дзяржавы тыя былі прадметам гандлю. Да таго ж спаборніцтва паміж Генуяй і Венецыяй ды іншымі суб'ектамі Міжземнамор'я выклікала неймаверны хаос і знішчэнні. Суправаджалася гэта маральным упадкам палітычнага саслоўя. Паводзіны візантыйцаў і лацінікаў празмерна вызначалі гандлёвыя інтарэсы, зайздрасць, прывата, распуста, каварнасць, адсутнасць гонару. Часта так бывала, што ў выніку міжусобіц грэчаскія епіскапы звярталіся за дапамогай да турэцкіх войск. Вынікам гэтага была паступовая змена рэпутацыі хрысціян, асабліва візантыйцаў, у вачах мусульман. Я менавіта тут хачу падкрэсліць, што пачаткова іслам не быў так агрэсіўны, якім стаў пасля. І тая агрэсія выводзілася ў галоўнай меры з пагарды да хрысціян.

Пасвараныя з сабою хрысціяне не маглі зладзіць высілкаў дзеля стрымання пераможнага паходу асманаў. Заходнія дзяржавы таксама перажывалі крызіс. Гэта быў перыяд г.зв. авіньёнскага палону папаў, гэта быў час спробаў рэфармаваць Касцёл, гусіцкага руху. Сітуацыя тадышняга папы Яўгена IV не была з лёгкіх. Грэкі ўжо раней думалі пра ўнійныя размовы з сабранымі ў Базелі (1432-1437 гг.) біскупамі, аднак апошнія выступілі ў адрас грэкаў з такімі пастулатамі, якіх грэкі не маглі прыняць; яны прапанавалі грэкам выступаць з такіх пазіцый, якія раней былі адведзены гусітам. Гэтакім чынам грэкі парвалі спатканне ў Базелі, але прычыніліся да перамогі таго курсу папства, які патрабаваў прызнання папскага першынства.

24 лістапада 1438 года адправілася з Канстанцінопаля ў Ферару дэлегацыя канстанцінопальскага духавенства пад кіраўніцтвам імператара Яна VIII Палеалога, падарожжа фінансаваў папа; у складзе дэлегацыі былі таксама прадстаўнікі Масковіі і Рэчы Паспалітай. Сярод праваслаўных дэлегатаў вылучаўся нядаўна рукапаложаны ў сан епіскапа мітрапаліт Эфескі Марк. За ім былі паўнамоцтвы Антыёхскага і Александрыйскага патрыярхаў. Адзначаўся ён адукаванасцю і святасцю жыцця. Аднак уласцівым лідарам грэкаў быў сам імператар; гэта ён схіліў да ўніі Канстанцінопальскага патрыярха Іосіфа II, які, не зважаючы на хваробу, паехаў у Ферару; там ён і памёр. Паехалі туды таксама новахіратанізаваныя епіскапы — значыць унія была падрыхтавана і ў персанальным плане — значыць імператар свядома настояў на рукапалажэнне новых епіскапаў, да якіх меў свой давер; выключэннем быў толькі св. Марк Эфескі. Яшчэ да пачатку сустрэчы ў Ферары лацінікі сфармулявалі чатыры пытанні для разгляду. Першым было навучанне пра Святы Дух, г.зн. „Філіёквэ", другім быў спосаб выконвання еўхарыстыі, трэцім было замагільнае жыццё (у тым і справа чысцілішча), у чацвёртым — першынство папы.

Найменш складанай справай лічылася пытанне чысцілішча, таму з гэтай тэмы і пачаліся спрэчкі. Св. Марк яшчэ ў прывітальным слове песімістычна паставіўся да перспектыў дагматычнага зладжання, хаця іншыя дэлегаты разлічвалі на паразу-

9 770546 196000

менне. Пасля пераносу абрад у Фларэнцыю з прычыны эпідэміі чумы, пачалася дэбата на тэму „Філіёквэ", хаця дыскусія пра чысцілішча закончылася безвынікова. Свядомасць безнадзейнасці багаслоўскіх высілкаў узбуйнела да той ступені, што значная частка грэчаскай дэлегацыі рашыла 31 сакавіка 1439 года пакінуць абрады і вяртацца дадому. Аднак імператар на гэта не дазволіў, ля брам Фларэнцыі былі пастаўлены стражы. Недарэчнасць багаслоўскай дэбаты засноўвалася на тым, што лацінскі бок не ўступаў у спрэчкі. Шматлікія заходнія назіральнікі, прысутныя на саборы, давалі рацыю грэкам. У Ферары шматразова лацінскія манахі ўскрыквалі, што рацыя за грэкамі. Гэта было невыносна лацінікам і ўжо ў Фларэнцыі публіка не была дапушчана. Лацінскі бок шматразова падкрэсліваў, што любая мілітарная дапамога грэкам залежыць ад іх згоды на багаслоўскія патрабаванні лацінікаў. Імператар настойваў, каб яго дэлегаты згадзіліся на „Філіёквэ", але не ўносілі гэтага дадатку ў Сімвал веры. Падкрэсліваў ён таксама патрэбу захавання праваслаўных літургічных абрадаў. Спярша не пагаджаліся з гэтым чатыры епіскапы, пасля астаўся толькі св. Марк. Дайшло да таго, што імператар на сустрэчы з папам вельмі адкрыта — але была гэта адкрытасць прыніжальная — спытаў, што атрымае ўзамен за падпісанне уніі. Папа адказаў, што імператар атрымае зварот коштаў падарожжа назад, трохсот ваякаў для абароны Канстанцінопаля, дзве галеры, чарговы крыжовы паход на Іерусалім праз Канстанцінопаль, і ў выпадку патрэбы — яшчэ дваццаць ваенных караблёў ды абяцанні хадайніцтва за дапамогай у заходнееўрапейскіў уладароў. Варта дадаць, што ў Ферары доўгі час чакалі прыбыцця заходніх уладароў, якіх таксама запрасілі на сабор, але ніхто з іх не з'явіўся.

Неўзабаве быў складзены акт уніі і пачалася зборка подпісаў пад ім; некаторыя грэкі атрымалі грашовыя прэміі за подпіс. Не падпісаўся толькі св. Марк Эфескі. Калі папа даведаўся пра Маркаву адмову, сказаў, што нічога не ўдалося дасягнуць. Было некалькі спроб схіліць св. Марка да подпісу; некаторыя дамагаліся пасадзіць яго ў астрог, яшчэ іншыя аддаць пад суд дзеля смяротнага прыгавору. Аднак імператар праявіў у гэтай справе рашучасць і не дазволіў на здзекі над св. Маркам.

Ужо пасля падпісання акта уніі лацінікі запатрабавалі ад грэкаў змен у літургічным жыцці ды выбару, яшчэ ў Фларэнцыі, чарговага, пасля памерлага Іосіфа II, канстанцінопальскага патрыярха, аднак грэкі на гэта не згадзіліся. Пасля вяртання дэлегатаў у Канстанцінопаль вернікі рашуча адкінулі прывезеныя імі змены. У 1442 годзе патрыярхі Антыёхіі, Александрыі і Іерусаліма таксама рашуча адкінулі ўнію і не прызналі новаабранага канстанцінопальскага патрыярха Мітрафана, які быў прыхільнікам уніі і не ўключылі яго ў дыптыхі. Імператар і патрыярх не пасмелі зачытаць акт уніі ў Канстанцінопалі. Па сутнасці фларэнтыйскую унію на Усходзе праігнаравалі.

Крыху інакш было на тэрыторыі Рэчы Паспалітай, куды заехаў мітрапаліт Ісідар. Да гэтага паслаў ён у Маскву ліст, у якім паведамляў пра вялікае шчасце, якое здарылася ў выніку Фларэнтыйскага сабора. У 1440 годзе прыбыў ён у Кракаў, дзе быў прыняты каралём і адправіў грэчаскую літургію ў кракаўскай кафедры, пазней разам з лацінскім біскупам пасвяціў новы касцёл каля Сандоміра. Аднак у той час у Кракаве яшчэ не прызнавалі ні папства Яўгена IV, які быў прадстаўніком цвёрдана курсу, ні Фелікса V, абранага Базельскім саборам. Толькі ў 1444 годзе Уладзіслаў Варненчык выдаў дэкрэт, у якім прызнаў Яўгена IV і зацвердзіў Фларэнтыйскую унію.

У Вялікім Княстве Літоўскім Ісідара прымалі як мітрапаліта, прамоўчваючы, аднак, тое, што ён з'яўляецца ўніятам і мае кардынальскі сан. У Маскву Ісідар уехаў пышна, адправіў набажэнства ва Успенскай царкве на Крамлі, абвясціў там акт уніі. Вялікі князь і баяры былі гэтым здзіўлены і на чацвёрты дзень князь загадаў арыштаваць мітрапаліта Ісідара. Стражы, аднак, стаялі так, каб ён мог уцячы.

Дзейнасць Ісідара паставіла перад Рускай царквой складаныя тэалагічныя пытанні: як сябе паводзіць у абставінах, калі першастаяцель, у гэтым выпадку канстанцінопальскі патрыярх, стаў ерэтыкам. Пошукі адказу на гэтае пытанне прывялі Рускую царкву да самастойнага выбару мітрапаліта і пазнейшага аб'яўлення аўтакефаліі. Істотную ролю ў гэтых пошуках сыграў захоп Канстанцінопаля туркамі ў 1453 годзе. Бо як жа ж тады выбіраць рускага мітрапаліта: ехаць у Канстанцінопаль, дзе мусіў бы ён атрымаць згоду турэцкага султана і толькі пасля гэтага патрыярх мог бы назначыць яго мітрапалітам. На гэта Масква не магла згадзіцца, таму і было там прынята рашэнне, што лепш будзе абраць свайго.

Унія не была прынята многімі Цэрквамі, пра пераход ва ўнію не можна гаварыць і ў выпадку праваслаўных у Рэчы Паспалітай. У 1500 годзе папа Аляксандр IV ў лісце да польскага караля Аляксандра і біскупа Войцеха пісаў, што да ўніятаў нельга мець даверу, бо яны адпраўляюць літургію як сабе хочуць, а найгоршае — не прызнаюць папы наследнікам апостала Пятра.

Нягледзячы на няўдачу Фларэнтыйскага сабора, справы ўніі не пераставалі займаць шматлікіх людзей так на ўсходзе, як і на захадзе. У XIV ст. яны прынялі новыя формы, якія адпавядалі новым палітычным канцэпцыям. Свой подых у справу ўнесла таксама рэфармацыя і няспынная прысутнасць заходніх дзяржаў ва ўсходняй частцы Міжземнага мора. Аднак, у агульным абрысе, каталіцкая канцэпцыя аставалася нязменнай і зводзілася яна да прыёму рымскіх правіл у чатырох галоўных пытаннях, якія ставіліся на Фларэнтыйскім саборы —

з ціхай надзеяй на лацінізацыю праваслаўнай літургіі. Гэта відаць хаця б у працах Пятра Скаргі, і гэта бачна ў падрыхтоўцы Брэсцкай уніі, бо ў 1595 годзе прадстаўнікі рускага духавенства, якія падаліся ў Рым, нават не маглі прадставіць сваіх 33 пастулатаў, якія мелі абумовіць пераход ва ўнію. Іх у Рыме праігнаравалі і наступіла поўнае падпарадкаванне праваслаўных прыхільнікаў уніі ў Рэчы Паспалітай рымскаму епіскапу.

Князь Канстанцін Астрожскі быў тыповым прадстаўніком Праваслаўнай царквы і раскол яе моцна яго забалеў. Лепш ад многіх іншых, не толькі сучасных яму палітыкаў, таксама і цяперашніх, бачыў, як агромны патэнцыял чалавечых магчымасцей скарыстоўваецца дзеля дэструкцыі. Марыў пра скарыстанне моцы аб'яднанага хрысціянства для працы дзеля перамены чалавека і стварэння напоўненай любоўю хрысціянскай культуры. Прагнуў ён адзінства ўсіх патрыярхаў у духу першапачатковай Царквы. Канстанцін Астрожскі быў асобай незвычайнай, трагічнай, з крутымі паваротамі лёсу, пра якога можна было б скласці шэкспіраўскія драмы. Ён дасведчыў усёй горычы здрады: тыя людзі, якім ён найбольш давяраў, ускладаў на іх надзею — тыя яму здрадзілі, абманулі. Ягонай памылкай, і няшчасцем было нябачанне таго, што яго шчырасць і шляхетнасць выкарыстоўваюцца для развалу таго, што ставіў ён сабе за мэту. Яго цыркулярны ліст ад 24 чэрвеня 1595 года з'яўляецца клічам чалавека, які ўрэшце пабачыў наколькі памыляўся ён адносна інтэнцый людзей, якім ён так садзейнічаў у царкоўным павышэнні, спадзяючыся, што ім святая праваслаўная вера гэтак жа каштоўная, як і яму. Здрада веры, а не адзінства Царквы здзейснілася ў апошнія гады ягонага жыцця.

Чарговы даклад „Паняцце святасці і кананізацыя ў праваслаўі" зачытаў беластоцкі **архіепіскап Іакаў**. Паколькі ён кранаў рэлігійна суб'ектыўную багаслоўскую тэму, таму не стану тут яе прыводзіць. Трэцім дакладчыкам быў **праф. Іван Чарота** з мінскага Белдзяржуніверсітэта:

Звышчасовае значэнне працы князя Канстанціна Астрожскага

Я рызыкну адважыцца на агульнае асэнсаванне, што ўяўляе сабою асоба князя Канстанціна Васіля Астрожскага ў ягоны час і па-за ягоным часам, якога мы ацэньваем несумненна пад уплывам бягучых нашых спраў, а трэба ўзяць пад увагу многія ўплывы. І тут нам, як яго спадчыннікам, непазбежна задумацца пра нашу адказнасць над ацэнкай гэтай асобы і адказаць на шэраг пытанняў. Першае: наколькі поўна і выразна мы ўсведамляем яго ролю і месца ў гісторыі, асэнсоўваем яго феномен, гатовы палічыць яго нацыянальным геніем. Ці мы дастаткова ўсведамляем ролю свайго пакалення і тых пакаленняў, што былі пераемнікамі і спадчыннікамі Канстанціна Васіля Астрожскага. Не ўсе дакументы захаваліся, а даступныя нам абраслі інтэрпрэтацыямі, не заўсёды адэкватнымі, але якія распаўсюдзіліся і дзейнічаюць. Нас бянтэжаць ацэнкі негатыўнага характару, напрыклад, стаўленыя маскоўскімі даследчыкамі, што ён верна служыў польскім каралям. А вядома ўсім, што ў 1569 годзе ён падпісаў акт далучэння Валыні да Польскага каралеўства. На пачатку падтрымліваў ідэю ўніі, звязаўся і супрацоўнічаў з неправаслаўнымі а то і ворагамі праваслаўя, быў прыхільны пратэстантам, не ўтрымаў у веры сваіх дзяцей. На цяперашні час яго ацэнкі розныя. І стаўленне да яго мяняецца, напрыклад, цяперашняе адрозніваецца ад таго, што было ў 1990-х гадах, калі было такое памкненне, каб уключыць яго ў асобныя, якія тады вылучаліся, нацыянальныя пласты.

Адносна значэння самой асобы князя мне хацелася б сфармуляваць сваё яго бачанне. Каб толькі ягоная справа абмяжоўвалася выданнем адной Бібліі — ён навекі ў гісторыі; каб толькі адна справа, што сабраў у 1596 годзе антыўнійны сабор у Брэсце — гэтым ён таксама заслужыў пачэснае месца ў гісторыі нашай Царквы, нашай усёй культуры. Каб толькі адна Астрожская акадэмія паўстала... Каб толькі адна друкарня... Але ж гэта яшчэ не ўсё, гаворыцца пра 600 храмаў... Гэта асоба, якая мела ўсеправаслаўны, усяленскі маштаб. Ён трымаў непасрэдны кантакт з Канстанцінопальскім патрыярхам, Антыёхскім, з Рымам, з Масквой. Асноўнае ж, гэта тое са спадчыны князя Астрожскага, што знаходзіцца вышэй часу і межаў. Яго палітычны аспект, як мне здаецца, быў зусім просты: Канстанцін Васіль быў сваім нам чалавекам: яго ўсе памкненні былі гэтым абумоўлены, што ён свой на сваім. Князь Астрожскі прызнаваў Праваслаўную царкву ўсяленскай Царквой, а не нацыянальнай. Заслугі Канстанціна Васіля Астрожскага вельмі значныя для свайго часу, але гэта значэнне значна выходзіць за рамкі таго часу і ён аказаў рашучы ўплыў на многія справы: развіццё асветы ў цэлым — школы, вучэбная літаратура (Буквар і Азбука), багаслоўская. Гэта значны ўплыў на стан Праваслаўнай царквы, захаванне яе культуры і перспектывы. Трэба таксама разг-

лядаць Астрожскую Біблію як факт перакладу з розных крыніц у адно. Найбольш зразумелі значэнне князя тыя даследчыкі, хто сам паходзіў з Заходняй Русі. Аде вельмі цікава заўважыць, што рускія стараверы таксама лічаць Канстанціна Астрожскага сваім стойкім апірышчам!

Дзякуй Богу за тое, што паслаў на нашу зямлю такога чалавека, слава Богу за тое, што ўчыніў нас спадчыннікамі духовага наследства князя Астрожскага. А гэта ўскладвае на нас пэўныя абавязкі, адказнасць за захаванне ягонай спадчыны.

Айцец **д-р Сяргей Гардун** з Мінска прачытаў даклад на тэму:

Справа літургічнага календара ў Рэчы Паспалітай у эпоху князя Канстанціна Астрожскага

Пры жыцці князя Канстанціна



Васіля Астрожскага ў 1582 годзе на Захадзе быў уведзены папам Грыгорыем XIII новы каляндар, новы стыль. Ён быў уведзены аўтарытарна, нягледзячы на шматлікія пратэсты. Але папа Грыгорый XIII не дапускаў да ніякай дыскусіі, ён быў па свайму характару чалавекам вельмі аўтарытарным, гэта той самы папа, па блаславленню якога адбылася Варфаламееўская ноч — разня гугенотаў у Парыжы.

На пачатку, калі новы каляндар уводзіўся, была спроба ўвядзення яго і ў Вялікім Княстве Літоўскім. Як сведчаць гістарычныя факты, гэтая спроба спачатку была вельмі інтэнсіўнай, былі выпадкі, калі, напрыклад, львоўскі епіскап каталіцкі на праваслаўнае Ражджаство загадаў закрыць храмы і нікога туды не ўпускаць. Былі бунты, звязаныя з гэтым, бурныя выказванні незадавальнення, і тады афіцыйныя ўлады сваю пазіцыю палагодзілі. Калі была спроба ўвядзення новага стылю, князь Канстанцін Васіль Астрожскі звяртаецца па гэтаму пытанню ў Канстанцінопаль, да патрыярха, з пытаннем, як Праваслаўнай царкве трэба ставіцца да новага календара. Гэты факт звароту князя Канстанціна ў Канстанцінопаль дае магчымасць ацаніць асобу князя. Ён звяртаецца па гэтай патрэбе не да Кіеўскага мітрапаліта, які ўзначальваў Царкву ў Рэчы Паспалітай, не ў сабор епіскапаў, якія час ад часу збіраліся. Князь, які сам не быў епіскапам, адчувае сваю адказнасць за лёс Царквы ці не больш за ўсіх епіскапаў разам узятых, і па гэтаму канкрэтнаму пытанню вядзе перапіску з патрыярхам. І вось з прычыны гэтага звароту князя Астрожскага, у Канстанцінопалі адбываецца сабор, які абмяркоўвае гэтае пытанне аб календары і прымае рашэнне, што стары каляндар лепшы, што новы каляндар гэта спроба папы паказаць сваё першынство, сваё вяршэнства і падпарадкаваць сабе іншых хрысціян. Князь Канстанцін Астрожскі, атрымаўшы гэтае рашэнне з Канстанцінопаля, паслухмяна і пакорліва падпарадкоўваецца гэтаму рашэнню і бароніць яго.

Яшчэ пару слоў хачу сказаць аб нашай працы ў Беларусі, нашай Беларускай біблейскай камісіі, якая была створана ў 1991 годзе і займаецца перакладам Свяшчэннага пісання на беларускую мову. Спачатку мы выдавалі ўсе чатыры евангеллі на чатырох мовах: з арыгінальным грэчаскім тэкстам, царкоўнаславянскім, рускім сінадальным тэкстам і беларускім. Наступным этапам нашай працы была падрыхтоўка і выданне Евангелля богаслужэбнага, дзе тэксты ўсіх евангелістаў разам, яны падзелены на зачалы, і ўсе яны, як у царкоўнаславянскім нашым Евангеллі, дзе паказана, якое зачала якім словам павінна пачынацца, дзе канчацца і ў якія дні адпраўляцца; усе гэтыя пункты з царкоўнаславянскага Евангелля перанесены ў беларускае, і гэта дае магчымасць ужываць беларускі тэкст у богаслужэнні, але яно дае таксама магчымасць верніку зачытаць адпаведныя зачалы дома і гэтак нарыхтавацца да малітвы ў храме. Такім чынам гэтае Евангелле можа выкарыстоўвацца не толькі для адпраўлення богаслужэнняў на беларускай мове, але і для чытання яго дома.

Акрамя Евангелля богаслужэбнага Брацтва трох віленскіх мучанікаў пры Петрапаўлаўскім саборы выдала таксама малітваслоў у беларускім перакладзе. Людзі, якім цяжка чытаць царкоўнаславянскі тэкст, могуць ранішнія ці вячэрнія малітвы прачытаць на беларускай мове. Яшчэ зроблены пераклады на беларускую мову чына хрышчэння, чына вянчання, і ў тых выпадках, калі людзі просяць павянчаць або ахрысціць па-беларуску, мы гэта робім.

Гэтая праца важная яшчэ і ў тым аспекце, што наша Праваслаўная царква ў Беларусі, на жаль, сутыкаецца з праблемамі неразумення сваёй пазіцыі, а нават ёсць спробы прыніжэння ролі Праваслаўнай царквы ў жыцці беларускага народа, асабліва ў нацыянальнай культуры Беларусі. Часта ў т.зв. апазіцыйнай сферы гучаць абвінавачанні ў адрас Праваслаўнай царквы, што яна не цэніць нацыянальную беларускую культуру. На жаль, гэтыя абвінавачанні знаходзяць падтрымку ў некаторых сродках масавай інфармацыі, асабліва ў апазіцыйных сродках, напрыклад, на Радыё „Свабода" ці ў Польскім радыё на беларускай мове. Гэтыя абвінавачанні несправядлівыя, бо Праваслаўная царква ў большай меры чым любая іншая канфесія мела на Беларусі ярка выражаны нацыянальны характар. Але пра гэта трэба сведчыць, пра гэта трэба гаварыць так у гістарычным, як і ў сучасным аспекце. Каб да людзей, якія любяць беларускую мову, якія хочуць чуць беларускую мову, мы, свяшчэннаслужыцелі, маглі звярнуцца на беларускай мове. І ўдзел у гэтых перакладах я ўсведамляю як частку сваіх пастырскіх абавязкаў.

Д-р Лідзія Кулажанка зачытала даклад на тэму:

Ацэнка дзейнасці князя Канстанціна Астрожскага раней і цяпер

Канстанцін Астрожскі з'яўляец-

ца асобай, якая перакрочыла свой час і таму ягонае месца будзе асэнсоўвацца цяпер і ў будучыні. Таму нам вельмі важна ўлічваць тыя ацэнкі, якія даваліся князю пры яго жыцці яго сучаснікамі і ў пазнейшы час гісторыкамі, пісьменнікамі ці тэолагамі. Пры жыцці ацэнкі дзейнасці князя яго сучаснікамі былі пераважна станоўчымі, у тым ліку і польскія гісторыкі ацэньвалі яго пазітыўна; але былі і выключэнні. Праўда, католікі ўслаўлялі кіеўскага ваяводу князя Астрожскага за ягоныя ваенныя перамогі над татарамі, а пратэстанты хвалілі князя за яго талерантныя адносіны з евангелікамі. Але найбольш пахвалы пры жыцці заслужыў князь Астрожскі ад праваслаўных, найперш за сваю шчодрасць у справе царкоўнага кцітарства, непахіснасць у барацьбе з уніяй. Найбольш паэтычна і вобразна згадваў пра яго рэктар Астрожскай акадэміі Герасім Сматрыцкі, які да выдання Астрожскай Бібліі, якая выйшла ў 1581 годзе, напісаў пахвальнае слова князю Астрожкаму: *У Канстанціне, князю з Астрога, сторажу верных, дадзеным ад Бога, маем раўніўца веры праваслаўнай продкамі князя выбранай ад даўна...* Аднак прынцыповая і актыўная барацьба князя Астрожскага з уніяй мела вынікам тое, што пад канец жыцця Астрожскі негатыўна ацэньваўся пераважнай большасцю каталіцкіх і ўніяцкіх аўтараў. Але трэба адразу зазначыць, што веліч яго постаці была такой, што некатоыя католікі і ўніяты ставілі яго за ўзор для перайманння. Вось езуіты былі ўпэўнены ў тым, што калі б Астрожскі перайшоў у каталіцтва, то заахвоціў бы да такога пераходу многіх і многіх іншых. Таму невыпадкова, што асноўная палемічная праца езуіта Пятра Скаргі „Аб еднасці Божага касцёла", дзе ён падрыхтаваў тэарэтычную глебу пад увядзенне уніі, мае прысвячэнне найбольшаму праціўніку гэтай уніі і абаронцу праваслаўя князю Канстанціну Астрожскаму. Цікава ўяўляецца таксама тая ацэнка, якая была дадзена князю пасля смерці караля Стэфана Баторыя, якая наступіла ў 1587 годзе, дзе складзены спіс магчымых кандыдатаў на польскі трон. Сярод іх быў названы і князь Канстанцін Канстанцінавіч Астрожскі. На думку складальнікаў гэты рускі магнат з'яўляўся: найзаможнейшым і найуплывовым панам ва ўсім каралеўстве. Па-другое — яго паўсюдна лічаць чалавекам разумным, шчырым, адкрытым, шчодрым і добрым у вышэйшай меры. Аднак дзве рэчы, як лічылі каментатары, што ўклалі гэты спісак, перашкаджаюць яму. Першае: гэта тое, што ён русін і таму здагадацца можна, што яго не захочуць палякі і літоўцы. А другое тое, што ён вызнае грэчаскую веру і лацінскія католікі будуць баяцца пашырэння гэтага веравызнання па ўсім каралеўстве.

Са смерцю Канстанціна Асторжскага завяршылася цэлая эпоха інтэлектуальнага і духовага адраджэння праваслаўя ў Заходняй Русі. І вось, цікава, ці заўважылі сучаснікі гэтае завяршэнне. Адсутнасць гэтай важнай асобы абазначае змену раўнавагі духоўна-рэлігійных сіл. Як ні дзіўна, тагачасныя праваслаўныя крыніцы не рэагуюць на смерць князя. Толькі ворагі спачылага з палёгкай уздыхнулі, напрыклад, уніяцкі мітрапаліт Іпацій Пацей ужо ў жніўні 1608 года выказаў надзвычайную радасць, што нарэшце памёр схізматык.

Цікава таксама, што каталіцкія аўтары таксама не прамінулі нагоды скласці пасмертны панегірык князю. І цікава яшчэ тое, што гэты панегірык яны памясцілі ў прамове з нагоды наведвання сынам Канстанціна, Янушам, Кракаўскай акадэміі ў 1613 годзе. Але князь Канстанцін пасля смерці Януша адышоў у забыццё. У тэкстах XVII і XVIII ст. імя князя Астрожскага сустракаецца вельмі рэдка. Сапраўднае вяртанне яго ў гісторыю адбылося толькі ў XIX стагоддзі, калі ў новых умовах сфармаваліся два крайнія пункты гледжання на яго. Першы — пазітыўны, апалагетычны, у асноўным велічаючы заслугі князя для праваслаўя; прадстаўнікі другога прыпісвалі нямала адмоўных рыс князю, заўважаючы яго супярэчлівасці ў палітычнай і рэлігійнай дзейнасці, а таксама ў яго светапоглядзе. Рускія гісторыкі падкрэслівалі, што князь успрымаў унію інакш чым другія, заўважаючы пра тыя ўмовы, якія князь лічыў неабходнымі пры заключэнні ўніі. Падкрэсліваецца, што галоўным матывам для заключэння ўніі была для князя згода прадстаўнікоў усіх праваслаўных Цэркваў, а не толькі некаторых іерархаў. У XIX стагоддзі гісторыкі шырока асвятлялі і асветніцкую дзейнасць князя. Меркавалася, што можа князю і не ўдалося здзейсніць усяго задуманага ім, але тое што ён зрабіў павінна ў нашчадкаў цаніцца з такой жа пашанай, з якой адносіліся да яго ягоныя сучаснікі.

Тацяна Матрунчык з Мінска расказала пра

Урачыстасці ў гонар 400-й гадавіны смерці князя Канстанціна Астрожскага ў Беларусі і Украіне

Калі мы пачыналі рыхтавацца да ўшанавання князя Астрожскага, мы не пачыналі з нуля, а з прадаўжання той традыцыі, якая была запачаткавана сто гадоў таму. Калі дзесяць гадоў таму мы пазнаёміліся з матэрыяламі святкавання 300-годдзя памяці князя, мы былі ўражаны тым размахам, які набылі тыя святкаванні. Сто гадоў таму ініцыятарамі маштабных святкаванняў стала Царква і грамадскія арганізацыі. Дзесяць гадоў таму мы адзначылі 390-годдзе смерці князя, былі праведзены прысвечаныя яму чытанні, было здзейснена ўстанаўленне помніка князю ў Тураве, была здзейснена, з удзелам прысутных тут прадстаўнікоў Польскай праваслаўнай царквы, паломніцкая паездка ў Астрог. Падрыхтоўка да сёлетніх святкаванняў пачалася год таму, калі ад імя Беларускай праваслаўнай царквы былі звернуты лісты ва ўніверсітэты, у дзяржаўныя ўстановы адукацыі і культуры з інфармацыяй пра юбілейную дату і запрашэннем да ўдзелу. Важна было падкрэсліць, што князь не быў дзеячам у вузкім царкоўным сэнсе, але і прыкладным для нашых сучаснікаў дзяржаўным дзеячам. Ну, некаторыя грамадскія і дзяржаўныя арганізацыі не надта ўтульна пачуліся, таму што пэўны стэрэатып астаўся. Але паколькі мы стараліся даць поўную інфармацыю пра асветніцкую і культурную дзейнасць князя, гэта прымусіла дзяржаўныя і грамадскія суб'екты ўсё ж такі крыху задумацца пра значэнне дзейнасці князя і трэба сказаць, што адгукнуліся на прапанову Царквы беларускія міністэрствы і культуры, і адукацыі, і інфармацыі і ўжо выступілі з сустрэчнымі прапановамі і праграмамі. Наступіла супрацоўніцтва дзяржаўных, царкоўных і грамадскіх арганізацый у правядзенні мерапрыемстваў, якія прайшлі ў Беларусі. Ад самага пачатку 2008 год быў абвешчаны годам памяці князя Астрожскага. У пачатку лютага Сінод Беларускай праваслаўнай царквы звярнуўся з пасланнем да веруючых з нагоды 400-годдзя памяці Астрожскага; пра гэта ўрачыста абвясціў мітрапаліт Мінска-Слуцкі Філарэт у час урачыстага набажэнства ў мінскім Петрапаўлаўскім саборы 17 лютага. Пасля літургіі адбылося пасвячэнне памятнага крыжа. У той самы дзень у Петрапаўлаўскім саборы адбылося ўрачыстае гашэнне памятнай маркі і паштовага блока; гэта была ініцыятыва Міністэрства сувязі Беларусі, якое само распрацавала дызайн праекта. Гэтая падзея была шырока асвечана сродкамі масавай інфармацыі. У дзень спачыну князя, 26 лютага, у храмах Беларускай праваслаўнай царквы адбыліся паніхіды ў памяць князя Астрожскага; трэба адзначыць, што ў Петрапаўлаўскім саборы гэтыя паніхіды адпраўляліся рэгулярна ад дзесяці гадоў. Па ініцыятыве Брацтва трох віленскіх мучанікаў да гэтага дня праводзілі асветніцкія г.зв. Астрожскія чытанні. У той самы дзень, 26 лютага, на радзіме князя Астрожскага, у горадзе Тураве, па ініцыятыве Міністэрства культуры адбыўся канцэрт з удзелам Камернага хора Белдзяржфілармоніі, калі ўпершыню прагучала харавая кантата, напісаная па нашым сёлетнім звароце нашай сучаснай кампазітар Ганнай Казловай. Далі ёй тэкст Герасіма Сматрыцкага, той тэкст, які якраз змешчаны ў прадмове да Астрожскай Бібліі. Гэты тэкст узнёсла ўсхваляе подзвіг князя, дзе параўноўваецца яго з роўнаапостальным князем Уладзімірам, дзе гаворыцца, напрыклад, што Уладзімір знакам крыжа перамог палкі ворагаў, а Канстанцін — узброіўшыся зброяй Свяшчэннага пісання перамог палкі супастатаў. Тады кантата прагучала часткова, цалкам яна яшчэ не гучала ніколі; спадзяемся, што гэта адбудзецца неўзабаве.

Наступным важным мерапрыемствам па ініцыятыве Міністэрства культуры і Нацыянальнай бібліятэкі была выстаўка ў лютым г.г. астрожскіх выданняў, якія захаваліся ў фондах Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі, у тым ліку і славутая Астрожская Біблія. Дзеля азнаямлення як найбольшай колькасці наведвальнікаў са спадчынай князя Астрожскага, выстава працавала ў выхадныя дні.

Міністэрства культуры дапамагло Брацтву выдаць і Беларускі праваслаўны каляндар, дзе адзін раздзел займае пераклад на сучасную беларускую мову Акружнога паслання князя Астрожскага, дзе ён заклікае праваслаўных вернікаў цвёрда стаяць у бацькоўскай веры. Уражвае багаслоўскае мысленне князя, дзяржаўнага дзеяча; вось, каб сучасныя дзяржаўныя дзеячы хоць на нейкую долю імкнуліся да такога багаслоўскага асэнсавання рэчаіснасці, то наша жыццё выглядала б інакш. Будучы патронам Царквы на такім вялікім абшары, князь абсалютна сябе не ўзвялічвае, а лічыць кожнага веруючага роўным сабе.

Усе гэтыя мерапрыемствы былі скіраваны на тое, каб абудзіць грамадскую свядомасць, таму што недахоп адукацыі і інфармацыі пра час князя Астрожскага адчувальны. Важнай была ініцыятыва Беларускага педагагічнага ўніверсітэта правесці для студэнтаў ды навучэнцаў гімназій і ліцэяў канферэнцыю, якая адбылася ў сакавіку. І лічу вельмі важным, што моладзь уключылася ў справу ўсведамлення і асэнсавання дзейнасці князя Астрожскага. 11 мая ў Тураве адбыўся пачатак прысвечанай князю навуковай канферэнцыі, якой працяг адбыўся ў наступны дзень, 12 мая, у Брэсце. Удзел у канферэнцыі прынялі навукоўцы і багасловы з Украіны, Польшчы і Расіі. Вынікі канферэнцыі былі прадстаўлены на пасяджэнні сінода Беларускай праваслаўнай царквы, дзе была пастаўлена справа кананізацыі князя і сінод даў адмысловай камісіі даручэнне вывучыць гэтае пытанне. Названыя ўрачыстасці дазваляюць сцвердзіць, што подзвіг князя Астрожскага і яго служэнне працягваюцца і цяпер, так як подзвіг і служэнне святых не спыніліся з іх смерцю. Цяпер мы звяртаемся да князя Астрожскага, да яго жыцця, да яго дзейнасці і чэрпаем адтуль сілы і ўсведамленне, узор адказнасці за жыццё Царквы.

Зявяршэнне

З заключнай часткі канферэнцыі варта вылучыць выступленне **Яна Зенюка**, які сказаў:

Гэтыя даклады, якія мы мелі радасць выслухаць, яны далі нам веды, як вырашаць праблемы, з якімі маем дачыненне сёння. І добра, што гэтыя даклады будуць выдадзены і спадзяюся, што іх можна будзе выкарыстаць на курсах для ўдасканальвання настаўнікаў Закону Божага, якія будуць арганізаваны на працягу гэтага і наступных гадоў. З другога боку, мы маглі пачуць, што ў Беларусі так многа выдадзена рэлігійнай літаратуры на беларускай мове. У нас, на Беласточчыне, каля чатырох тысяч дзяцей вывучае беларускую мову. Яго Блажэнства, уладыка, падкрэсліў, што навучанне Закону Божага павінна ўключаць таксама вывучэнне роднай мовы, традыцыі. І выдаў такі цыркуляр: там, дзе навучаецца беларуская мова, там таксама трэба навучаць Закону Божаму і на беларускай мове. І высветлілася — а я гэтай справай акурат займаюся — што ў нас нічога не было. І трапіла да мяне Святое пісанне для дзяцей, выдадзенае ў Мінску, цудоўнае, якога адзін экземпляр прывёз студэнт з Брэста. Я з „Братчыкам" стаў хадайнічаць і з дапамогай консула мы атрымалі больш за сто экземпляраў гэтага выдання. І сапраўды, гэта стала буйным узбагачэннем навучання Закону Божага на роднай мове. „Братчык" хоча далучыцца да гэтай плыні, але я прасіў бы — калі б можна было ад вас гэта атрымаць — Евангелле на беларускай мове і іншыя — яны б нам саслужылі добрую службу нашай мове і нашай культуры. Я б прасіў, каб гэтым узбагаціць навучанне Закону Божага, нашай традыцыі і культуры.

Канферэнцыю завяршыў **уладыка Іерэмія**, які падкрэсліў:

Асаблівай прыкметай святых з'яўляецца тое, што чым далей ад дня іх смерці, тым больш яны значаць і тым святлей свецiць іхняя асабовасць. І мы тут маем прыклад гэтага. Нічога выпадковага ў жыцці Царквы не бывае, а тут дзеянне адбывалася і на Украіне, і ў Беларусі, і ў Польшчы — і таму трэба было б скласці такі кароценькі заклік свяцейшаму патрыярху Алексію ды блажэннейшым мітрапалітам Уладзіміру, Філарэту і Саву, такую скромную просьбу аб кананізацыі.

Вёў абрады дэпутат Сейма **Яўген Чыквін**. Гэта вельмі паказальны факт: князь Астрожскі быў абаронцам праваслаўя ў перыяд І Рэчы Паспалітай, а Яўген Чыквін з'яўляецца заступнікам праваслаўя ў эпоху III і IV Рэчы Паспалітай, духовым спадкаемцам князя. Я тут рызыкну і адважуся дапусціць, што калі гісторыя пакоіцца колам, то за стодзвесце гадоў магчымая такая ж дакананізацыйная канферэнцыя ў гонар нашага спадара Яўгена.

Наканец яшчэ адна мая заўвага: усе выступленні, апрача епіскапскіх, адбываліся на чыстай беларускай літаратурнай мове. Асабліва ўразілі мяне фанетычнай чысцінёй госці з Беларусі — у іх выступленнях не было ні следу так характэрнага там маскоўскага намулу. А вось нашы ўладыкі постам ад сваёй літаратурнай мовы, мабыць, прынеслі такую асаблівую ахвяру ў інтэнцыі яе будучага працвітання ў Царстве Нябесным.